ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ”

Аб’ект аўтарскага права
УДК 94(476)“1921/1939”

ДАНІЛОВІЧ
Вячаслаў Віктаравіч

# МОЛАДЗЬ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук

по спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2023

Навуковая работа выканана ў дзяржаўнай навуковай установе “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

**Навуковы кансультант:** **Каваленя Аляксандр Аляксандравіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Афіцыйныя апаненты:** **Анісяеў Міхаіл Андрэевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар;

**Палятаева Наталля Іванаўна**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”;

**Ходзін Сяргей Мікалаевіч**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Апаніруючая арганізацыя:** установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”.

Абарона адбудзецца 30 чэрвеня 2023 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.40.01 на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры дзяржаўнай навуковай установе “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, тэл. вучонага сакратара: (8-017) 379-18-34, e-mail: lakvadim@yandex.ru

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы – 26 мая 2023 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый В. Л. Лакіза

# УВОДЗІНЫ

Адным з найбольш складаных і супярэчлівых перыядаў беларускай гісторыі з'яўляюцца 1921–1939 гг. У гэты час у Савецкай Беларусі адбываліся кардынальныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні.

У маштабнай перабудове грамадства ўдзельнічала моладзь[1]. Шмат у чым яна з'ўлялася ініцыятарам пераўтварэнняў, спадзяваючыся, што будаўніцтва новага ладу жыцця адкрые выразную перспектыву для рэалізацыі яе памкненняў.

У краіне была разгорнута ідэйна-палітычная і адукацыйна-культурная работа. Гэта дазволіла актывізаваць працоўную і сацыяльную актыўнасць маладых грамадзян, якія ў выніку атрымалі адукацыю, дамагліся росту сацыяльнага і культурнага дабрабыту.

*Актуальнасць тэмы дысертацыі* абумоўлена тым, што ў гістарыяграфіі да гэтага часу не было створана комплекснай дысертацыйнай работы, прысвечанай навуковаму асэнсаванню сутнасці і зместу, выяўленню перыядаў, кірункаў і форм удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі на працягу 1921–1939 гг.

Нягледзячы на значную тэматычную разнастайнасць апублікаваных работ, праблемы разгортвання маладзёжнага руху, форм і кірункаў удзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці, мадэрнізацыі індустрыяльнай і аграрнай вытворчасці, развіцці культуры не атрымалі неабходнага навукова-тэарэтычнага асэнсавання і тлумачэння. Найперш гэта тычыцца неабходнасці ўліку гістарычнага вопыту, назапашанага ў справе разгортвання маладзёжнага руху, форм і кірункаў удзелу моладзі ў мадэрнізацыі індустрыяльнай і аграрнай вытворчасці, развіцці культуры, патрыятычным і грамадзянскім выхаванні. Усё гэта было вынікам мэтанакіраванай дзейнасці органаў улады, адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу, працоўных калектываў, маладзёжных арганізацый па вырашэнні асноўных задач дзяржаўнай палітыкі.

У сучасных умовах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, глабальнай нестабільнасці і інфармацыйных войнаў аб'ектыўнае асвятленне мінулага вопыту маладзёжнага руху і яго буйнейшай грамадскай арганізацыі – камсамола, як з'явы-феномена айчыннай гісторыі, з'ўляецца надзвычай надзённым.

За перыяд з 1991 па 2021 гг. у нацыянальнай гістарыяграфіі падыходы да вывучэння і ацэнкі складаных сацыяльных працэсаў, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. карэнным чынам змяніліся. Яны арыентаваны на ўсебаковае даследаванне грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай праблематыкі з апорай на грунтоўную метадалогію, выкарыстанне дасягненняў навейшай беларускай гістарыяграфіі, найперш

---

[1] У дысертацыі пад моладдзю разумеюцца асобы ва ўзросце ад 14 да 30 гадоў, у тым ліку падлеткі ва ўзросце 14–18 гадоў.

канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці, якая рэалізавана ў пяцітомнай "Истории белорусской государственности".

*Актуальнасць тэмы дысертацыі, яе навуковая і сацыяльная запатрабаванасць* абумоўлены неабходнасцю ўліку асаблівасцей і спецыфікі развіцця маладзёжных ініцыятыў у мінулым з тым, каб забяспечыць шырокае прыцягненне сучаснай беларускай моладзі да ўдзелу ў развіцці Рэспублікі Беларусь як дзяржавы для народа, а таксама ў рэалізацыі правоў і абавязкаў, замацаваных ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 27 лютага 2022 г.

Выкарыстанне вопыту маладзёжнага руху асабліва карысна ў сучасных умовах мадэрнізацыі грамадска-палітычнага, духоўна-культурнага сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны і неабходнасці актыўнага ўключэння моладзі ў стваральную дзейнасць па ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці, захаванні сацыяльнай стабільнасці, нацыянальнай згоды і трывалай гістарычнай сувязі паміж пакаленнямі адзінага народа, забеспячэнні паспяховага развіцця суверэннай Беларусі.

У Рэспубліцы Беларусь арганізацыйна аб'яднаная, адукаваная, арыентаваная на захаванне нацыянальна-гістарычных каштоўнасцей і традыцый моладзь адыгрывае, як і ў 1920–1930-я гг., асабліва адметную ролю ў жыцці грамадства. Яна здольна аказваць вырашальны ўплыў на бліжэйшую будучыню і гістарычную перспектыву Беларусі.

Значныя храналагічныя межы даследавання, выклікалі неабходнасць выдзялення пэўных перыядаў у працэсе ўдзелу моладзі ў пабудове новага грамадства. У аснову перыядызацыі пакладзены аўтарскія падыходы да вызначэння сутнасці, зместу і асаблівасцей дзейнасці маладзёжных арганізацый, а таксама паказчыкі іх станаўлення і развіцця.

У дысертацыі раскрыты асноўныя тэндэнцыі і перыяды станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі, асэнсаваны асаблівасці нацыянальнага маладзёжнага руху. Выяўлены і ахарактарызаваны формы ўдзелу моладзі ў дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і кіравання, вызначаны масштабы гэтай важнай сацыяльнай з'явы.

У Рэспубліцы Беларусь органы дзяржаўнай улады і кіравання, распрацоўваючы нарматыўна-прававую базу маладзёжнай палітыкі, напрамкі і формы ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці краіны, бяруць пад увагу асаблівасці і спецыфіку, станоўчыя і негатыўныя тэндэнцыі, якія ўплываюць на сацыяльны прагрэс грамадства, з'яўляюцца вызначальным элементам жыцця ўсяго народа.

У гэтай сувязі *навуковая і сацыяльная актуальнасць тэмы даследавання* абумоўлена і неабходнасцю прыцягнуць ўвагу шырокай грамадскасці да лёсавызначальнай ролі маладога пакалення нашай краіны ва ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці, захаванні сацыяльнай стабільнасці, забеспячэнні нацыянальнай згоды і трывалай гістарычнай сувязі паміж пакаленнямі адзінага народа.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне падрыхтавана ў рамках распрацоўкі задання 05 "Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах XIX–XX стст." Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры"; задання 1.2.02 "Палітыка, эканоміка і сацыяльная сфера ў Беларусі (1917–1991 гг.)" падпраграмы "Гісторыя і культура" Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава"; задання 1.1.03 "Беларусь у гістарычным працэсе: сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі і грамадска-культурныя змены (канец XVIII – пачатак XXI ст.)" падпраграмы № 1 "Гісторыя і культура" Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства".

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэтай* дысертацыйнага даследавання з'яўляецца раскрыццё зместу і форм удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг., устанаўленне важнейшых перыядаў, выяўленне дасягненняў і недахопаў у дзейнасці маладзёжных арганізацый.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных *задач*:

1) вызначыць і абгрунтаваць перыяды станаўлення і развіцця камсамола, ахарактарызаваць змест і асаблівасці яго працы;
2) раскрыць змест і формы дзейнасці нацыянальных маладзёжных арганізацый;
3) вызначыць і абгрунтаваць перыяды развіцця ідэйна-палітычнай асветы моладзі, выявіць формы адпаведнай працы камсамола;
4) высветліць ролю і месца камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзейнасці дзяржаўных органаў улады і кіравання;
5) вызначыць формы і асаблівасці ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці;
6) раскрыць формы ўдзелу, вызначыць дасягненні і недахопы ў дзейнасці камсамольскіх арганізацый і несаюзнай моладзі па вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем, мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі;
7) выявіць формы і ўстанавіць значэнне ўдзелу камсамольскіх арганізацый і несаюзнай моладзі ў працэсе станаўлення і развіцця сістэмы адукацыі;
8) высветліць уклад моладзі ў культурнае будаўніцтва.

**Аб'ект даследавання** – палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае і культурнае жыццё Савецкай Беларусі ў 1920–1930-х гг.

**Прадмет даследавання** – моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі 1921–1939 гг.

**Тэрытарыяльныя межы даследавання** ахопліваюць тэрыторыю ССРБ і беларускія тэрыторыі, перададзеныя ў 1919 г. у склад РСФСР, якія ў 1924 і

1926 гг. былі ўз’яднаны з БССР.

**Храналагічныя межы даследавання** ахопліваюць перыяд з 1921 па 1939 гг. Ніжняя мяжа вызначаецца завяршэннем польска-савецкай вайны, верхняя абумоўлена пачаткам Другой сусветнай вайны.

**Навуковая навізна.** У дысертацыі ўпершыню ў гістарычнай навуцы комплексна раскрыты працэс удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі у складанейшы перыяд дзяржаўнага будаўніцтва 1921–1939 гг.

Праведзенае на аснове сістэмнага вывучэння шырокага комплексу крыніц, з улікам дасягненняў гістарычнай навукі даследаванне дазволіла выявіць перыяды станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі; адлюстраваць асаблівасці нацыянальнага маладзёжнага руху; раскрыць формы і выявіць перыяды развіцця палітычнай асветы маладога пакалення; вызначыць характэрныя рысы дзейнасці камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў дзяржаўных органах і Саветах; адлюстраваць асаблівасці ўдзелу юнакоў і дзяўчат у грамадска-палітычным жыцці; раскрыць ролю камсамола і несаюзнай моладзі ў станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі; выявіць перыяды ўдзелу маладога пакалення ў нацыянальна-культурным жыцці і ажыццяўленні культурнага будаўніцтва; адлюстраваць удзел камсамола і несаюзнай моладзі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем, развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Даказана, што дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх органаў, пераадольвалася тэндэнцыя вагання грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат, павялічваўся іх інтарэс да грамадскіх аб’яднанняў, імкненне да ўступлення ў камсамол, што садзейнічала сацыялізацыі маладога пакалення.

Даказана, што важнымі заканамернасцямі будаўніцтва Савецай Беларусі, якія стваралі перадумовы для забеспячэння шырокай сацыяльнай падтрымкі ўлады, з’яўлялася павелічэнне колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання, забеспячэнне яе сацыяльна-эканамічных правоў і ўдзел юнакоў і дзяўчат у разнастайных формах культурнага будаўніцтва.

Устаноўлена, што грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі, стваралі аб’ектыўныя ўмовы для заснавання і дзейнасці нацыянальных арганізацый моладзі, якія пакінулі адметны след у грамадска-палітычным жыцці краіны.

Выяўлена, што дзейнасць нацыянальных і рэлігійных арганізацый перашкаджала пашырэнню колькаснага складу камсамола і яго ўплыву сярод моладзі.

Высветлена, што важным напрамкам дзейнасці маладога пакалення з’яўляўся ўдзел у сацыяльна-эканамічным будаўніцтве.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Палітычнае кіраўніцтва Савецкай Беларусі аказвала актыўную падтрымку дзейнасці моладзі, асабліва заснаванню і працы камсамольскіх арганізацый. Вызначаны чатыры ўзаемазвязаныя перыяды станаўлення і дзейнасці камсамола Савецкай Беларусі. Першы ахапіў 1921–1923 гг., калі

адбывалася арганізацыйнае станаўленне камсамола і падрыхтоўка яго кіруючых кадраў. Асаблівасцю гэтага перыяду з'яўляўся колькасны рост шэрагаў маладзёжнага саюза і яго арганізацый. Другі перыяд прыпаў на 1924–1927 гг. Ён характарызаваўся ростам аўтарытэта камсамола ў грамадстве, асабліва ў асяроддзі маладога пакалення, маштабным пашырэннем колькаснага складу і заснаваннем трывалай структуры камсамольскіх арганізацый ва ўсіх раёнах БССР. Трэці перыяд разгортваўся ў 1928–1933 гг. Характэрнай яго асаблівасцю з'явілася праяўленне апазіцыйных настрояў у шэрагу камсамольскіх арганізацый і нават палітычнай барацьбы, што стала прычынай арганізацыйнага крызісу ЛКСМБ і прывяло да скарачэння колькаснага складу маладзёжнага саюза. Чацвёрты перыяд прыпаў на 1934–1939 гг., калі была разгорнута работа па пераадоленню крызісісных з'яў у ЛКСМБ, умацаванню ўнутрысаюзнай дысцыпліны і статутных нормаў дзейнасці, што прывяло да значнага пашырэння шэрагаў камсамольцаў і колькасці камсамольскіх арганізацый.

2. Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі, стваралі аб'ектыўныя ўмовы для заснавання і дзейнасці нацыянальных арганізацый моладзі, якія пакінулі адметны след у грамадска-палітычным жыцці краіны. Важнейшай іх асаблівасцю была арыентацыя на ўмацаванне традыцыйных нацыянальна-культурных каштоўнасцей у маладога пакалення, што вызначыла спецыфіку сацыяльнага і колькаснага складу арганізацый, а таксама іх дзейнасці, асноўнымі формамі якой былі правядзенне вечарын, сходаў, акцый, выданне і распаўсюджванне агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры.

Маладзёжныя беларускія аб'яднанні і гурткі некамуністычнай плыні не мелі масавага характару і да сярэдзіны 1920-х гг. іх легальная дзейнасць была прыпынена. Нешматлікія з іх перайшлі да працы па-за прававым полем, але яны выяўляліся і ліквідаваліся ўладамі.

Асаблівую адметнасць мелі арганізацыі яўрэйскай моладзі, якія падзяляліся на дзве ідэйныя плыні – камуністычную і сіяніcцкую. Значны ўплыў у асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат меў ЯКСМ. Да 1923 г. ён з'яўляўся рэальным канкурэнтам КСМБ. Характэрнай асаблівасцю сіяніcцкіх маладзёжных арганізацый было размежаванне на сацыялістычныя і кансерватыўныя, а таксама адукацыйна-культурныя аб'яднанні. Апошняя спроба актывізацыі дзейнасці сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі была прадпрынята лідарамі руху напрыканцы 1920-х гг., аднак падтрымкі з боку моладзі яна не атрымала і была спынена ўладамі.

Дзейнасць нацыянальных маладзёжных арганізацый стрымлівала пашырэнне складу камсамольскіх структур і распаўсюджванне камуністычнай ідэалогіі ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат. Тым не менш у выніку мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі ЛКСМБ атрымаў шырокую падтрымку ў асяроддзі маладога пакалення і ўжо з другой паловы 1920-х гг. з'яўляўся адзінай легальнай арганізацыяй моладзі ў БССР.

3. У працэсе арганізацыі ідэйна-палітычнай асветы моладзі вылучаны

чатыры ўзаемазвязаныя перыяды. Першы ахапіў 1921–1923 гг., калі адбывалася станаўленне сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы ў форме палітгурткоў і палітшкол. Яго асаблівасцю з'яўляўся недахоп кваліфікаваных кіраўнікоў, спецыяльнай метадычнай літаратуры і фінансавых сродкаў. Другі перыяд разгарнуўся ў 1924–1928 гг., калі, нягледзячы на складанасці, адбывалася пастпальнае развіццё форм арганізацыйна-выхаваўчай работы: шырокае распаўсюджванне палітычнай перыёдыкі, дзейнасць агітбрыгад, маладзёжных клубаў, курсаў і дамоў палітычнай асветы. Трэці перыяд ахапіў 1929–1935 гг., калі з-за арганізацыйнага крызіса ЛКСМБ сістэма ідэйна-палітычнай асветы моладзі прыйшла ў заняпад, яе ўплыў на юнакоў і дзяўчат знізіўся. Чацвёрты перыяд прыпаў на 1936–1939 гг., калі адбылося аднаўленне сістэмы ідэйна-палітычнай асветы маладога пакалення, пашырэнне адпаведных структур, павышэнне кваліфікацыі і якасці працы іх персаналу. У выніку напрыканцы 1930-х гг. дзейнічала разгалінаваная сістэма маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы, якой былі ахоплены каля 265 тыс. камсамольцаў і несаюзных юнакоў і дзяўчат БССР.

4. Адметнай тэндэнцыяй грамадска-палітычнага будаўніцтва Савецай Беларусі з'яўлялася павелічэнне колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання, што стварала передумовы неабходныя для забеспячэння шырокай падтрымкі ўлады. З гэтай мэтай была створана сістэма ідэйна-палітычнай падрыхтоўкі кіруючых кадраў у форме камсамольскіх і партыйных палітшкол, куды накіроўваліся найбольш здольныя камсамольцы. Акрамя таго, у Саветы прыцягваліся не толькі члены камсамола, большасць сярод маладых дэпутатаў складалі несаюзная юнакі і дзяўчаты. Моладзь удзельнічала ў барацьбе з бюракратызмам дзяржаўнага апарату, парушэннямі законнасці праз узаемадзеянне з органамі рабоча-сялянскай інспекцыі і дзейнасць груп "лёгкай кавалерыі".

5. Кіраўніцтва камсамола Савецкай Беларусі імкнулася актыўна ўплываць на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення праз правядзенне разнастайных мерапрыемстваў і пашырэнне камсамольскага прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях. Важным напрамкам дзейнасці камсамола з'яўляўся ўдзел яго членаў у рабоце прафсаюзаў. Асаблівая ўвага надавалася наладжванню прафсаюзнай працы сярод студэнцтва. Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы ажыццяўлялі значную работу па развіцці ў маладзёжным асяроддзі кааператыўнага руху. Аднак грамадска-палітычную дзейнасць моладзі стрымлівалі фармалізм і адсутнасць вопыту.

Тым не менш, дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх органаў, пераадольвалася тэндэнцыя вагання грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат, павялічваўся іх інтарэс да грамадскіх аб'яднанняў, імкненне да ўступлення ў рады камсамола, што садзейнічала сацыялізацыі маладога пакалення. Паступова ЛКСМБ стаў галоўнай арганізуючай сілай грамадска-палітычнага жыцця моладзі БССР.

6. Важным напрамкам дзейнасці моладзі з'яўляўся ўдзел у сацыяльна-эканамічным будаўніцтве Савецкай Беларусі. Камсамол вёў актыўную

дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і правоў маладога пакалення, арганізацыі яго ўдзелу ў адбудове эканомікі. Але да сярэдзіны 1930-х гг. тэмпы працы ЛКСМБ адставалі ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, большасць працоўнай моладзі БССР не мела кваліфікацыі ці была малакваліфікаванай, шырока і трывала забяспечыць правы юнакоў і дзяўчат у сацыяльна-эканамічнай сферы не ўдавалася.

Адной з найбольш выніковых форм з'яўлялася разгорнутае камсамолам сацыялістычнае спаборніцтва. У 1930-я гг. масавы характар у маладзёжным асяроддзі БССР набыў стаханаўскі рух. У выніку ўдзел юнакоў і дзяўчат у сацыялістычным спаборніцтве, руху перадавікоў і наватараў быў важным фактарам датэрміновага выканання рэспублікай пяцігадовых планавых заданняў, мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Структуры камсамола Савецкай Беларусі вялі мэтанакіраваную барацьбу з асацыяльнымі з'явамі ў маладзёжным асяроддзі. Праведзеная работа пазітыўна адбівалася на павышэнні прадукцыйнасці працы, удасканаленні метадаў гаспадарання, спрыяла зніжэнню злачыннасці сярод моладзі.

Значная ўвага ў дзейнасці камсамола надавалася калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Аднак у ЛКСМБ выразна выявіліся супрацьлеглыя падыходы ў адносінах да яе ажыццяўлення. Толькі ў 1930-я гг. арганізацыі ЛКСМБ у сваёй дзейнасці на вёсцы пачалі аддаваць прыярытэт працы ў калгасах.

7. З пачатку 1920-х гг. адным з важных напрамкаў дзейнасці камсамольцаў, рабфакаўцаў і студэнтаў з'яўлялася праца па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод насельніцтва. Камсамольскія структуры актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні агульнаадукацыйных школ, школ рабочай і сялянскай (калгаснай) моладзі, арганізацыі вячэрняй адукацыі і падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў працоўных ва ўстановах пачатковай прафесійнай асветы. Значную ролю ў накіраванні на вучобу ў ССНУ і ВНУ выхадцаў з рабочых і сялян адыгрывалі камітэты камсамола. Дзякуючы сумеснай дзейнасці партыйных і камсамольскіх органаў, педагагічных калектываў удасканальвалася падрыхтоўка маладых спецыялістаў, павялічвалася колькасць студэнцтва. У выніку моладзь на чале з камсамолам аказала станоўчы ўплыў на арганізацыю і развіццё сістэмы адукацыі.

8. Важнай сферай дзейнасці моладзі з'яўляўся ўдзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, у якім можна вылучыць чатыры перыяды. Першы ахапіў 1921–1924 гг. і вызначаўся арганізацыяй і актыўнай працай нацыянальна-культурных гурткоў моладзі. Другі прыпаў на 1925–1928 гг., калі, дзякуючы мэтанакіраванай працы структур ЛКСМБ, адбылася актывізацыя ўдзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве. Трэці перыяд ахапіў 1929–1934 гг., калі з-за ўзмацнення барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам адбыўся спад удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Чацвёрты перыяд прыпаў на 1935–1939 гг. і вызначаўся ажыўленнем і актывізацыяй нацыянальна-культурнай працы сярод юнакоў і

дзяўчат, галоўным яе напрамкам стала прапаганда пралетарскага інтэрнацыяналізма і дружбы народаў СССР.

Дзейнасць рэлігійных арганізацый перашкаджала пашырэнню колькаснага складу камсамола і яго ўплыву сярод моладзі. Барацьба з рэлігійнымі настроямі ажыццяўлялася шляхам антырэлігійнай прапаганды і прыцягнення моладзі да ўдзелу ў масавых антырэлігійных акцыях. У выніку напрыканцы 1930-х гг. атэістычны светапогляд пераважаў сярод юнакоў і дзяўчат Савецкай Беларусі.

Адным з асноўных напрамкаў сацыяльнай палітыкі, якую ажыццяўлялі органы дзяржаўнай улады і кіравання Савецкай Беларусі, з’яўлялася ўключэнне моладзі ў разнастайныя формы культурнага будаўніцтва: укараненне савецкіх святаў і шлюбнай абраднасці, распаўсюджванне новых традыцый пралетарскай салідарнасці і братэрства. Рухавіком карэнных зменаў у галіне культурнага будаўніцтва з’яўляліся камсамольцы.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дадзеная дысертацыя з’яўляецца першым у гістарычнай навуцы самастойным комплексным даследаваннем, у якім на грунце выкарыстання шырокага кола апублікаванай айчыннай і замежнай літаратуры, вялікага пласту архіўных крыніц асэнсавана сутнасць, адлюстраваны канцэптуальны змест, тэндэнцыі, заканамернасці, асаблівасці ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг.

У дысертацыі даказана, што дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх органаў, пераадольвалася тэндэнцыя вагання грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат, павялічваўся іх інтарэс да грамадскіх аб’яднанняў, імкненне да ўступлення ў камсамол, што садзейнічала сацыялізацыі маладога пакалення.

У дысертацыі ўстаноўлена, што адметнымі заканамернасцямі будаўніцтва Савецай Беларусі, якія стваралі перадумовы для забеспячэння шырокай сацыяльнай падтрымкі ўлады, з’яўлялася павелічэнне колькасці моладзі ў органах дзяржаўнага кіравання, забеспячэнне яе сацыяльна-эканамічных правоў і ўключэнне юнакоў і дзяўчат у разнастайныя формы культурнага будаўніцтва.

Абгрунтаваны вывад, што буйным напрамкам дзейнасці маладога пакалення з’яўляўся ўдзел у сацыяльна-эканамічным будаўніцтве.

Важным дасягненнем аўтарскага даследавання з’яўляецца вызначэнне характэрных асаблівасцей і абгрунтаваны доказ наяўнасці чатырох перыядаў станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі; чатырох перыядаў у развіцці ідэйна-палітычнай асветы моладзі; чатырох перыядаў удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыі і вынікі даследавання прадстаўлены аўтарам у дакладах і выступленнях на наступных канферэнцыях: Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду

настаўнікаў XXI стагоддзя” (Мінск, 6 снежня 2002 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі” (Мінск, 28 лістапада 2003 г.); Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя” (Мінск, 18–19 красавіка 2003 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Формирование гражданской культуры молодёжи в условиях интеграции Республики Беларусь в европейское образовательное пространство” (Віцебск, 8–9 снежня 2004 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Проблемы методологии исследований истории Беларуси” (Мінск, 26–27 кастрычніка 2006 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада)” (Мінск, 7–9 верасня 2007 г.); Першых Гарадоцкіх краязнаўчых чытаннях “Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра” (Гарадок, 26 кастрычніка 2007 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Октябрь 1917 года в судьбе мировой цивилизации (к 90-летию Октябрьской революции)” (Мінск, 2 лістападая 2007 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Гомельщина в событиях 1917–1945 гг.” (Гомель, 27 лістапада 2007 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР)” (Мінск, 18 снежня 2008 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Полацк у гісторыі і культуры Еўропы” (Полацк, 22–23 мая 2012 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі” (Мінск, 24–25 верасня 2015 г.); Трэцяй міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў” (Полацк, 14–15 красавіка 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Проблемы рационального использования природных ресурсов и устойчивое развитие Полесья” (Мінск, 14–17 верасня 2016 г.); Чацвёртай міжнароднай навуковай канферэнцыі “Метадалогія даследавання гісторыі Беларусі: праблемы, дасягненні, перспектывы” (Мінск, 21–22 кастрычніка 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Революция 1917 года в России” (Масква, 29–31 сакавіка 2017 г.); Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Белорусская государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.)” (Мінск, 29 чэрвеня 2017 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “1917 год у гістарычных лёсах Беларусі” (Мінск, 30 лістапада – 1 снежня 2017 г.); Чацвёртай міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў (да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта)”, (Полацк, 19–20 красавіка 2018 г.); Міжрэгіянальнай навукова-практычнай канферэнцыі “Российская молодёжь: от комсомола к современным формам политической организации” (Навасібірск, 30–31 кастрычніка 2018 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.” (Мінск, 29–30 лістапада 2018 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “От Версаля и Веймара до образования двух Германий (ФРГ и ГДР, 1919–1949 гг.): актуальные вопросы исторической германистики,

отечественной и всеобщей истории, геополитики и международных отношений, социально-гуманитарных наук и права” (Віцебск, 3–4 кастрычніка 2019 г.); Другой міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава” (Гродна, 11–12 лістапада 2021 г.).

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе ў Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава, Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Еўфрасінні Полацкай, Універсітэце грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя вынікі даследавання апублікаваны ў 55 навуковых працах, выкананых аўтарам самастойна, у тым ліку ў манаграфіі (56,6 аўт. л.) і 25 артыкулах у навуковых выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (18,9 аўт. л.); 7 замежных навуковых выданнях (5,6 аўт. л.); а таксама ў 1 раздзеле калектыўнай манаграфіі (2,2 аўт. л.), 10 артыкулах у іншых навуковых выданнях (7,5 аўт. л.) і 18 публікацыях матэрыялаў навуковых канферэнцый (10,5 аўт. л.).

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі складае 298 старонак, з якіх дадаткі займаюць 29 старонак. Бібліяграфічны спіс аб’ёмам 40 старонак ўтрымлівае 847 пазіцый, уключаючы асабістыя публікацыі аўтара.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У першай главе **“Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія і канцэпцыя даследавання”** вызначаецца ступень распрацаванасці прадмета даследавання ў гістарыяграфіі, акрэслены і ахарактарызаваны комплекс крыніц, на якіх грунтуецца дысертацыя, вызначана яе метадалагічная база.

У раздзеле 1.1 *“Гістарыяграфія праблемы”* адзначаецца, што прадмет дысертацыйнай працы адносіцца да ліку недастаткова даследаваных.

Актуальныя задачы, ход іх выканання, а таксама пэўны аналіз дасягненняў і праблем дзейнасці камсамола БССР адлюстраваны ў выданнях 20–30-х гг. ХХ ст., прымеркаваных адпаведна да яго з’ездаў і пленумаў[1], прысвечаных пытанням ажыццяўлення камсамолам рэспублікі

---

[1] Тезисы докладов к VIII-му Всебелорусскому съезду ЛКСМБ : одобр. Бюро ЦК ЛКСМБ. – Минск : [б. и.], 1926. – 63 с.; Палякоў, М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ на Х з’ездзе / М. Палякоў. – Менск : Выд-ва ЦК ЛКСМБ, 1931. – 80 с.; Герцовіч, Л. Б. За большэвізацыю ЛКСМБ / Л. Б. Герцовіч. – Менск : Партвыдавецтва, 1933. – 32 с.; Аўгустайціс, А. В. Пад сцягам партыі Леніна-Сталіна да новых перамог : справаздач. дакл. ЦК на ХІ з’ездзе ЛКСМБ, 13 сак. 1936 г. / А. В. Аўгустайціс. – Менск : Белпартвыд-ва ЦК КП(б)Б, 1936. – 33 с. і інш.

сельскагаспадарчай[1] і побытавай працы[2], антырэлігійнай барацьбы[3], а таксама дзейнасці такой грамадскай маладзёжнай ініцыятывы як “лёгкая кавалерыя”[4]. Некаторыя тагачасныя выданні адлюстроўваюць сацыяльна-эканамічнае становішча рабочай моладзі[5], удзел маладога пакалення ва ўдасканаленні працы тэхнікумаў[6], маладзёжныя ініцыятывы па стварэнні камун[7].

Асаблівае месца займае манаграфія Б. Олікера і Л. Розенблюма[8], якая пасутнасці з’яўляецца першай спробай асэнсавання стварэння і працы саюза. Яе аўтары разглядалі яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Югенд-бунд і Югенд-ферэйн як папярэднікаў і аснову камсамола Савецкай Беларусі, лічылі мінімальнай ролю кампартыі ў стварэнні саюза і кіраўніцтве ім. Таму гэта кніга была абвешчана ідэйна варожай. Аднак сучасны аб’ектыўны навуковы аналіз архіўных дакументаў і матэрыялаў у значнай ступені пацвярджае слушнасць шэрага высноў Б. Олікера і Л. Розенблюма. Тым не менш адмоўная рэакцыя на іх працу прывяла да таго, што чарговая спроба пэўнага абагульнення вопыту дзейнасці камсамола Савецкай Беларусі была зроблена толькі ў 1940 г., калі выйшла даволі аб’ёмная гістарычная даведка[9].

Больш глыбокае даследаванне гісторыі камсамола Савецкай Беларусі пачалося толькі з другой паловы 1950-х гг. У выніку да канца 80-х гг. ХХ ст. быў апублікаваны шэраг прац па гэтай тэматыцы.

З іх перш за ўсё неабходна адзначыць працы А. Журава[10], у якіх адлюстраваны працэс стварэння камсамольскіх арганізацый Савецкай Беларусі, іх роля ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, гаспадарчым будаўніцтве, раскрыты формы і метады кіравання імі кампартыяй.

Удзел камсамола Савецкай Беларусі ў гаспадарчым аднаўленні адлюстраваны М. Шклярам[11], у правядзенні масавай калектывізацыі –

---

[1] Комсамолец за плугам : зб. гутарак. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 192 с.; Свенціцкі, А. М. У паход за павышэнне і ахову соцураджаю / А. М. Свенціцкі. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1934. – 31 с.

[2] Шамшур, П. У чалавечым лёсе: пра бытавую работу комсамолу / П. Шамшур. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – 51 с.

[3] Клібанаў, А. Камсамол на фронце бязбожжа: як весці камсамолу антырэлігійную прапаганду / А. Клібанаў. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1930. – 96 с.

[4] Лёгкая кавалерыя : зборнік / ЦК ЛКСМБ. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1930. – 76 с.

[5] Дихтяр, С. Р. Рабочая молодежь Белоруссии: численность, состав, быт, условия труда и физическое состояние (по материалам медико-санитарного обследования 1925 г.) / С. Р. Дихтяр, Б. Я. Смулевич, Д. Л. Эйнгорн. – Минск : Беларус. мед. думка, 1926. – 156 с.

[6] Чырвоны тэхнік : прысвяч. 10-ай гадавіне пралет. студэнцтва БССР. – Менск : Політэхнікум, 1929. – 56 с.

[7] Найштат, А. Комуны моладзі : па матэрыялах абследаваньня / А. Найштат, І. Рыўкін, І. Саснавік ; пер. з рус. мовы А. Корбуш. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 76 с.

[8] Олікер, Б. Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі / Б. Олікер, Л. Розенблюм. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1927. – 294 с.

[9] Дваццаць год Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі : гіст. даведка / склад.: І. Ефройкін [і інш.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1940. – 120 с.

[10] Жураў, А. Е. Комсамол Беларусі ў барацьбе за соцыялізм (1918–1941 гг.) / А. Е. Жураў. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1957. – 76 с.; Журов, А. Под руководством партии: деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии, 1917–1925 гг. / А. Журов. – Минск : Беларусь, 1970. – 216 с.; Жураў, А. Я. У баях народжаны : карот. нарыс гісторыі камсамола Беларусі / А. Я. Жураў. – Выд. 2-е, дап. – Мінск : Нар. асвета, 1970. – 221 с.

[11] Шкляр, М. Комсамол Беларусі ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі (1921–1925 гг.) / М. Шкляр. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 31 с.

А. Бабчынскім[1], у стварэнні навучальных устаноў працоўных рэзерваў для падрыхтоўкі кадраў рабочых – Я. Мазуравай[2]. Некаторыя аспекты ўдзелу саюза ў дзяржаўным будаўніцтве 1921–1939 гг. прадстаўлены ў працы Г. Жуковіч[3], якая храналагічна ахоплівае 20-я – 60-я гг. ХХ ст.

Шэраг пытанняў шэфства камсамола Савецкай Беларусі над Балтыйскім флотам даследавалі А. Петрашкевіч і С. Елісаў[4]. Праблеме ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі прысвечана манаграфія П. Чыгрынава[5].

Падборка лічбавых і фактычных даных па гісторыі камсамола Савецкай Беларусі прадстаўлена ў выданні “Комсомол Белоруссии. Цифры и факты”[6].

Знакавай з’явай у даследаванні гісторыі беларускага камсамола ад утварэння і да сярэдзіны 70-х гг. ХХ ст. стала калектыўная манаграфія “Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии”[7]. У ёй разгледжаны кірункі дзейнасці саюза. Аднак шматпланавасць працы і яе шырокія храналагічныя рамкі не дазволілі падрабязна і глыбока прааналізаваць дзейнасць камсамола Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг.

Праблемы развіцця маладзёжнага друку ў Савецкай Беларусі першай паловы 1920-х гг. знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі А. Слукі[8].

У даследаванні У. Навіцкага і Я. Новіка[9] абагулены вопыт работы камсапмола краю па развіцці народнай адукацыі ў міжваенны перыяд.

Праблематыка шэрага кірункаў дзейнасці камсамола Савецкай Беларусі знайшла адлюстраванне ў кандыдацкіх дысертацыях А. Бабчынскага, М. Капітонавай, А. Слукі, С. Дахія, П. Чыгрынава, Р. Ермашкевіча, І. Каменскай, У. Навіцкага, Я. Піульскага, С. Альшэўскай, У. Медзяніка, Д. Хромчанкі, А. Бендзіна[10].

---

[1] Бабчынскі, А. Комсамол Беларусі ў гады колектывізацыі сельскай гаспадаркі (1929–1934 гг.) / А. Бабчынскі. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 37 с.

[2] Мазурова, Я. Комсомол и подготовка рабочих в системе трудовых резервов БССР : очерки / Я. Мазурова ; под ред. Н. В. Каменской. – Минск : Беларусь, 1964. – 297 с.

[3] Жукович, Г. С. Участие комсомола в государственном управлении / Г. С. Жукович. – Минск : Наука и техника, 1969. – 116 с.

[4] Петрашкевич, А. Шеф краснознаменной Балтики / А. Петрашкевич, С. Елисов. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1963. – 98 с.

[5] Чыгрынаў, П. Да абароны Радзімы: дзейнасць камсамола Беларусі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі (1938 – чэрвень 1941 гг.) / П. Чыгрынаў. – Мінск : Беларусь, 1973. – 124 с.

[6] Комсомол Белоруссии : цифры и факты / текст подгот. П. Чигриновым. – Минск : Беларусь, 1968. – 78 с.

[7] Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии / А. Е. Журов [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – 536 с.

[8] Слука, О. Г. Голос революционной молодежи: проблемы становления и развития молодежной печати Белоруссии / О. Г. Слука. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. – 141 с.

[9] Новицкий, В. И. Участие Ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъем народного образования (1920 – июнь 1941 гг.) / В. И. Новицкий, Е. К. Новик. – Минск : Наука и техника, 1979. – 269 с.

[10] Альшевская, С. И. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в культурном строительстве республики в годы второй пятилетки (1933–1937 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / С. И. Альшевская ; Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1978. – 24 с.; Бабчинский, А. И. Комсомол Белоруссии – помощник Коммунистической партии в борьбе за коллективизацию сельского хозяйства (1930–1934 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / А. И. Бабчинский ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1956. – 15 с.; Бендин, А. Ю. Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию студенческой молодежи (1928–1937 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / А. Ю. Бендин ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1989. – 22 с.; Дахия, С. Ф. Комсомол Белоруссии – верный помощник КП(б)Б в индустриализации республики (1926–1932 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.570 / С. Ф. Дахия ; Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марсизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск, 1971. – 22 с.; Ермашкевич, Г. И. Комсомол Белоруссии –

Пачатковы этап узаемадзеяння камсамола і кампартыі на тэрыторыі Савецкай Беларусі быў абагулены ў доктарскай дысертацыі А. Журава[1], а пытанні развіцця камсамольскага друку на тэрыторыі Беларусі міжваеннага перыяду – у доктарскай дысертацыі А. Слукі[2].

Як бачна, з указанай праблематыкі найбольш даследаванымі ў савецкі перыяд пытаннямі з'яўляліся арганізацыя адукацыі юнага пакалення і ўклад у гэтую справу камсамола; станаўленне і развіццё маладзёжнага і камсамольскага друку; палітасветная дзейнасць камсамола ў 1921–1925 гг. і ў 1938–1939 гг.; узаемадзеянне камсамола і кампартыі ў 1921–1925 гг.; праца камсамола па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі, стварэнні і кіраўніцтве піянерскай арганізацыяй у 1921–1925 гг.; удзел камсамола ў аднаўленні народнай гаспадаркі, у індустрыялізацыі 1926–1932 гг. і арганізацыі сацыяплістычнага спаборніцтва на прамысловых прадпрыемствах у 1933–1937 гг., у культурным будаўніцтве 1928–1937 гг., у падрыхтоўцы кадраў сельскіх механізатараў у 1928–1937 гг. і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў 1929–1934 гг.

У гістарыяграфіі Рэспублікі Беларусь асноўныя кірункі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў БССР у 1920-я гг., разгледжаны ў кандыдацкай дысертацыі і манаграфіі Н. Мусінай[3]. Аднак комплексна ўдзел моладзі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных працэсах у рэспубліцы ў гэтых працах не прадстаўлены, бо аўтарам зроблены ўхіл на стварэнне сацыяльна-псіхалагічнага партрэта маладога пакалення.

Цалкам прысвечана праблеме беларускага нацыянальнага маладзёжнага

---

помощник партии в подготовке и воспитании кадров сельских механизаторов (1928–1937 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Г. И. Ермашкевич ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1972. – 25 с.; Каменская, И. В. Политико-просветительная работа комсомола Белоруссии в период восстановления народного хозяйства (1921–1925 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / И. В. Каменская ; Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1973. – 30 с.; Капитонова, М. И. Деятельность комсомола Белоруссии по созданию и руководству пионерской организацией республики (1918–1925 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.570 / М. И. Капитонова ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1970. – 18 с.; Медяник, В. И. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в организации социалистического соревнования на промышленных предприятиях республики в годы второй пятилетки (1933–1937 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / В. И. Медяник ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1978. – 24 с.; Новицкий, В. И. Участие комсомола Белоруссии в осуществлении культурной революции (1928–1932 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / В. И. Новицкий ; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск, 1975. – 21 с.; Пиульский, Е. В. Деятельность комсомола Белоруссии по военно-патриотическому воспитанию молодежи в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Е. В. Пиульский ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1975. – 26 с.; Слука, О. Г. Молодежная печать Белоруссии 1918–1925 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.580 / О. Г. Слука ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1971. – 24 с.; Хромченко, Д. Н. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в коммунистическом воспитании молодежи в годы третьей пятилетки (1938 – июнь 1941 г.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Д. Н. Хромченко ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1985. – 20 с.; Чигринов, П. Г. Деятельность комсомола Белоруссии по военно-патриотическому воспитанию молодежи в годы третьей пятилетки (1938–1941 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.570 / П. Г. Чигринов ; Ин-т истории партии при ЦК КП Белоруссии – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск, 1971. – 25 с.

[1] Журов, А. Е. Деятельность коммунистической партии Белоруссии по созданию и руководству ЛКСМБ (1918–1925 гг.) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук / А. Е. Журов ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1967. – 32 с.

[2] Слука, О. Г. Комсомольская печать Белоруссии: проблемы становления, развития и ее роль в строительстве социализма, 1918–1941 гг. : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.10 / О. Г. Слука ; Ленингр. гос. ун-т. – Л., 1986. – 42 с.

[3] Мусина, Н. Е. Государственная молодежная политика в БССР в 20-е годы XX века : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Н. Е. Мусина ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2012. – 24 с.; Мусина, Н. Е. Государственная молодежная политика в БССР в 1920-е годы / Н. Е. Мусина. – Витебск : Витеб. гос. мед. ун-т, 2015. – 146 с.

руху ў другой палове XIX – 30-х гг. XX ст. праца У. Ляхоўскага[1]. Яна ўтрымлівае шматлікія цікавыя звесткі па перыядзе 1921–1939 гг., але ў ёй адсутнічае ўсебаковы аналіз умоў і напрамкаў дзейнасці тагачасных беларускіх нацыянальных маладзёжных арганізацый, што, відавочна, тлумачыцца шырокімі храналагічнымі межамі, вызначанымі аўтарам.

Пытанні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, сацыяльнай абароны моладзі, яе становішча ў сістэме адукацыі і прафсаюзах Савецкай Беларусі 1921–1930 гг. закрануты ў кандыдацкіх дысертацыях І. Раманавай, Н. Куракевіч, М. Сакалова, А. Салаўянава, А. Дубовік[2].

Некаторыя моманты ўдзелу моладзі ў беларусізацыі і краязнаўчым руху БССР, а таксама становішча маладых палякаў у рэспубліцы закрануты ў кандыдацкіх дысертацыях Т. Баталкі, А. Дзянісава і В. Жука[3]. У доктарскай дысертацыі М. Бяспалай[4] прыведзены факты з жыцця і дзейнасці вясковай моладзі Савецкай Беларусі 1921–1927 гг.

Як бачна, у гістарыяграфіі Рэспублікі Беларусь найбольш грунтоўна распрацаваны пытанні арганізацыі адукацыі юнага пакалення ў 1921–1930 гг. і падрыхтоўкі навуковых кадраў, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў БССР у 1920-я гг. Зроблены таксама значны, хоць і недастатковы, крок у справе даследавання дзейнасці беларускіх нацыянальных маладзёжных арганізацый у 1921–1939 гг.

Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі сведчыць, што да гэтага часу праблема ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. не стала аб’ектам глыбокага даследавання. У навуковай літаратуры прадстаўлены асобныя сюжэты гэтай праблематыкі. Многія пытанні дзейнасці моладзі Савецкай Беларусі дадзенага перыяду застаюцца маладаследаванымі.

Вышэйзгаданае сведчыць аб неабходнасці грунтоўнай распрацоўкі і комплекснага аналізу праблемы ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі

---

[1] Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў: чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 479 с.

[2] Дубовік, А. А. Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у перыяд НЭПа (1921–1929 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А. А. Дубовік ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2017. – 27 с.; Куракевіч, Н. І. Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у Беларусі (1921–1930 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Н. І. Куракевіч ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2002. – 22 с.; Раманава, І. М. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР, 1921–1930 гг. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. М. Раманава ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1999. – 19 с.; Соколов, М. Н. Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / М. Н. Соколов ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2002. – 22 с.; Соловьянов, А. П. Социальная защита подрастающего поколения в БССР (1921–1930 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А. П. Соловьянов ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2008. – 25 с.

[3] Баталко, Т. И. Строительство белорусской национальной школы в условиях политики белорусизации, 1921–1930 годы: общественно-политический аспект : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Т. И. Баталко ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1993. – 23 с.; Дзянісаў, А. У. Краязнаўчы рух у БССР у 20–30-я гг. XX ст. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. У. Дзянісаў ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2008. – 23 с.; Жук, В. Н. Польское национальное меньшинство в БССР (1921–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / В. Н. Жук ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2009. – 23 с.

[4] Бяспалая, М. А. Беларуская вёска ў 1921–1927 гг. : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / М. А. Бяспалая ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 1999. – 38 с.

1921–1939 гг.

У раздзеле 1.2 *“Крыніцы”* прааналізаваны комплекс крыніц па праблеме. Крыніцавую базу даследавання склалі дакументы і матэрыялы, якія ў сваёй сукупнасці даюць living разнабаковае ўяўленне аб усім комплексе пытанняў праблемы ўдзелу моладзі ў будаўніцтве Савецкай Беларусі.

Карысныя матэрыялы і даныя, у першую чаргу па гісторыі камсамола Савецкай Беларусі, утрымліваюць камсамольскія даведачна-інфармацыйныя выданні як шырокага профілю[1], так і канкрэтнай грамадска-палітычнай[2], і сацыяльна-эканамічнай [3] накіраванасці. Асобныя аспекты ўказанай праблематыкі адлюстраваны ў абагульняючых зборніках і статыстычных даведніках[4].

Змястоўныя даныя адносна колькасці, узросту, месцы пражывання, пісьменнасці юнакоў і дзяўчат БССР утрымліваюць матэрыялы перапісаў 1926 г.[5] і 1939 г.[6]

Цікавымі, хоць і суб’ектыўнымі крыніцамі ў вывучэнні гісторыі беларускага маладзёжнага руху з’яўляюцца ўспаміны актывіста беларускіх студэнцкіх арганізацый у БССР М. Ганчарыка[7].

У зборніках дакументаў і матэрыялаў, выдадзеных у 70-я – 80-я гг. XX ст., змешчаны пэўныя крыніцы па праблеме удзела маладога пакалення 1921–1939 гг. у аднаўленні народнай гаспадаркі, ажыццяўленні

[1] Комсомол Белоруссии 5 лет на аванпостах : сборник. – Минск : Белтрестпечать, 1924. – 136 с.; 10 год Ленінскага комсамолу Беларусі, 1918–1928 : матэрыялы для дакл. аб гадавіне ЛКСМБ. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1928. – 10 с.; Да IX зьезду ЛКСМБ: I. Вопыт грамадскай і гаспадарчай працы вясковых ячэек. II. Камсамол Беларусі ў лічбах. – Менск : Чырв. змена, 1928. – 70 с.; Рэзолюцыі III пленуму ЦК ЛКСМБ (люты 1929 г.). – Менск : Чырв. змена, 1929. – 64 с.; Комсамол і працоўная моладзь да X з’езда ЛКСМБ : у лічбах. – Менск : Цэнтр. кам. ЛКСМБ : Дзяржплан БССР, 1930. – 152 с.; Пастановы і рэзолюцыі другога Пленуму ЦК ЛКСМБ. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 28 с.; Пастановы і рэзолюцыі III пленуму ЦК ЛКСМБ. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1931. – 40 с.

[2] В помощь комсомольцу-политруку : сб. материалов политико-просветит. работы среди допризывников. – Минск : ЦК ЛКСМБ : Политсекретариат Белорус. воен. комиссариата, 1924. – 162 с.; Комсомол и его актив : стат. сб. о числ. и качеств. составе ВЛКСМ и актива за 1927 и 1928 гг. ; вып. XIX. – М. : 7-я тип. “Искра революции” Мосполиграфа ; Л. : Молодая гвардия, 1929. – 45 с.; Памятка камсамольцу да перавыбараў спажывецкай кааперацыі. – Менск : Чырв. змена, 1929. – 16 с.

[3] Паход ЛКСМБ за ўраджай і калектывізацыю сельскай гаспадаркі : зб. матэрыялаў / склад.: С. Туркін [і інш.]. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – 79 с.; Пачынаем социялістычнае спаборніцтва супраць: прагулаў, браку, разгільдзяйства, марнатраўства, “вочкаўціраецельства”, пустаслоўя, рабскіх адносін да варштату, за: культуру працы, павышэнне тэхнічных ведаў, беражлівыя, гаспадарчыя адносіны да варштату, машын, рацыянальнае скарыстанне кожнай капейкі, кожнага кавалачка матэрыялу. – Менск : Выд. ЦК ЛКСМБ, 1929. – 27 с.; Комсамол за сілос. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1930. – 29 с.; Комсамол за аўладаньне агратэхнікай : зборнік. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 94 с.; Комсамол у ашчадсправе : зб. матэрыялаў па ўдзеле комсамольцаў у развіцці ашчадсправы. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 39 с.

[4] Белорусская ССР в цифрах : к 10-летию существования БССР, 1919–1929 гг. / Центр. стат. упр. – Минск : [б. и.], 1929. – 534 с.; Культурное строительство БССР : стат. справ. / Упр. народнохоз. учета БССР. – Минск : Изд. УНХУ БССР, 1940. – 111 с.; Пагранічнікі : зб. XI з’езду ЛКСМБ. – Менск : Чырв. змена, 1936. – 72 с.; Резолюции Всероссийск. учредительн. конференции ; Программа и устав Е.С.С.Р.М. “Югенд Поалей-Цион” / Евр. соц. союз рабочей молодежи “Югенд Поалей-Цион”. – М. : 20-я гос. тип., 1921. – 30 с.

[5] Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г. : крат. сводки : в 10 вып. / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. Вып. 5 : Возраст и грамотность. Европейская часть РСФСР. Белорусская ССР. – М. : Изд. ЦСУ СССР, 1928. – XXV, 61 с.

[6] Всесоюзная перепись населения 1939 года : основ. итоги / Рос. акад. наук [и др.] ; сост.: Ю. А. Поляков [и др.] ; редкол.: Ю. А. Поляков (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1992. – 254 с.

[7] Ганчарык, М. М. Шлях ад пачатку стагоддзя : успаміны / М. М. Ганчарык. – Мінск : Нац. навук.-асветн. цэнтр, 2003. – 286 с.

індустрыялізацыі і калектывізацыі, сацыялістычным спаборніцтве[1].

Значна больш аб'ектыўным падыходам складальнікаў характарызуюцца зборнікі дакументаў і матэрыялаў, якія ўбачылі свет у Рэспубліцы Беларусь у пачатку XXI ст. і ўтрымліваюць пэўныя матэрыялы па даследуемай праблеме. Гэта зборнікі, прысвечаныя адлюстраванню тэндэнцый палітычнага і духоўнага жыцця Савецкай Беларусі ў 1925–1928 гг., ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гг.[2]

Асобна варта адзначыць выдадзены ў Расійскай Федэрацыі зборнік дакументаў аб жыцці дзяцей і моладзі Смаленшчыны ў 1920-я – 1930-я гг.[3]

У працы таксама выкарыстаны матэрыялы з архіваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі: дакументы дзяржаўных, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў розных узроўняў.

Асноўнай крыніцай даследавання праблемы сталі матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Найбольшы пласт дакументаў па ўдзеле моладзі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных працэсах знаходзіцца ў ф. 63п "Цэнтральны Камітэт Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі". У ф. 4п "Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі" маюцца дакументальныя крыніцы аб уплыве структур кампартыі на маладзёжны рух і актыўнасць юнакоў і дзяўчат у жыцці грамадства. Стратэгічныя кірункі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі прадстаўлены ў дакументах ф. 6 "Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР" і ф. 7 "Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь". Дакументальныя крыніцы аб удзеле моладзі ў станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі знаходзяцца ў ф. 42 "Міністэрства асветы БССР". Пэўныя пытанні працаўладкавання юнакоў і дзяўчат, аховы працы падлеткаў адлюстраваны ў ф. 44 "Народны камісарыят працы БССР". Дакументы аб дзейнасці моладзі па развіцці сельскай гаспадаркі змяшчае ф. 48 "Мінсельгасхарч Рэспублікі Беларусь". Удзел маладога пакалення ў працы органаў дзяржаўнага кантролю прадстаўлены ў ф. 101 "Народны камісарыят рабоча-сялянскай інспекцыі БССР", у ліквідацыі

---

[1] Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929 г. – 1932 г.) : сб. док. и материалов / сост.: Л. Н. Яшенко (отв. сост.), В. В. Грамович ; под ред. А. И. Азарова [и др.]. – Минск : Беларусь, 1973. – 424 с.; Индустриализация Белорусской ССР (1926–1941 гг.) : сб. док. и материалов / сост.: Л. Н. Яшенко (отв. сост.) [и др.] ; под ред. В. Н. Жигалова, А. Т. Нетылькина, Н. М. Хвостенковой. – Минск : Беларусь, 1975. – 465 с.; Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919–1941 гг.) : док. и материалы / сост.: Т. А. Воробьева (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: В. И. Вышинский [и др.]. – Минск : Беларусь, 1980. – 270 с.; Восстановление народного хозяйства БССР (1921–1925 гг.) : сб. док. и материалов / сост.: Э. Л. Козловская (отв. сост.), Л. Ф. Геращенко, К. Ф. Плахотникова. – Минск : Беларусь, 1981. – 268 с.; Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921–1925 гг.) : сб. док. и материалов / сост.: И. Б. Кудрявицкий [и др.] ; редкол.: М. Е. Шкляр [и др.]. – Гомель : [б. и.], 1960. – 680 с.; Завершение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов Белорусской ССР (1933 – июнь 1941 г.) : сб. док. и материалов / сост.: Р. С. Степурко (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: М. П. Костюк, В. В. Лашкевич, М. Е. Стрельцов. – Минск : Беларусь, 1985. – 284 с.

[2] Перед крутым поворотом. Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): отражение времени в архивных документах / авт.-сост.: Р. П. Платонов (рук.) [и др.] ; под общ. ред. Р. П. Платонова. – Минск : БелНИИДАД, 2001. – 309 с.; Беларусізацыя, 1920-я гады : дак. і матэрыялы / аўт.-склад.: У. К. Коршук [і інш.] ; пад агул. рэд. Р. П. Платонава, У. К. Коршука. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2001. – 268 с.

[3] Дети и молодежь Смоленщины, 1920–1930-е годы : док. и материалы / авт.-сост.: Т. И. Новосельцева, Н. Ф. Пикалова, Е. А. Потапова ; редкол.: Е. В. Кодин (отв. ред.) [и др.]. – Смоленск : Маджента, 2006. – 526 с.

непісьменнасці – у ф. 258 "Цэнтральны савет Усебеларускага таварыства "Далоў непісьменнасць", у атэістычнай прапагандзе – у ф. 261 "Цэнтральны савет Саюза ваяўнічых бязбожнікаў БССР". Дакументы па дзейнасці моладзі ў прафсаюзах знаходзяцца ў ф. 265 "Савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі", ф. 268 "Арганізацыйнае бюро студэнцкіх секцый пры ЦСПСБ". У ф. 701 "Камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце БССР" маюцца дакументы аб правядзенні нацыянальнай палітыкі ў маладзёжным асяроддзі.

Дакументальныя сведчанні аб дзейнасці маладых пісьменнікаў прадстаўлены ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, у ф. 225 "Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк" пры Інстытуце беларускай культуры".

Шэраг цікавых дакументаў, якія адлюстроўваюць праблему, што даследуецца, на мясцовым узроўні ўсходнебеларускіх тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад РСФСР, ёсць у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, у ф. 10112п "Віцебскі губернскі камітэт Расійскага камуністычнага саюза моладзі" і ў Дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, у ф. 7 "Гомельскі губернскі камітэт Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі".

Дакументы аб працы моладзі ў навуковай сферы прадстаўлены ў Цэнтральным навуковым архіве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: ф. 1 "Прэзідыум", ф. 1а "Аддзел навуковых кадраў", ф. 67 "Інстытут беларускай культуры".

Значная колькасць дакументальных матэрыялаў па ўказанай праблеме ўтрымліваецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ф. А1565 "Галоўнае упраўленне прафесійнай адукацыі Наркамата асветы РСФСР"; ф. А2313 "Галоўны палітыка-асветны камітэт пры Наркамаце асветы РСФСР"; ф. Р5207 "Камісія па паляпшэнні жыцця дзяцей пры Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце СССР"; ф. Р5451 "Усесаюзны цэнтральны савет прафесійных саюзаў"; ф. Р5462 "Цэнтральныя камітэты прафесіянальных саюзаў работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў"; ф. Р5515 "Народны камісарыят працы СССР"; ф. Р5574 "Арганізацыйнае бюро студэнцкіх секцый УЦСПС"; ф. Р6990 "Паўнамоцная камісія Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта па барацьбе з бандытызмам на Заходнім фронце", ф. Р7541 "Камітэт па зямельнаму ўладкаванню працоўных яўрэяў пры прэзідыюме Савета нацыянальнасцей Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР", ф. Р7576 "Камітэт фізічнай культуры і спорта СССР") і Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі (ф. М1 "Цэнтральны камітэт УЛКСМ"; ф. М32 "Цэнтральны камітэт Яўрэйскага камуністычнага саюза моладзі").

Матэрыялы тагачаснага зперыядычнага друку даюць яскравае адлюстраванне гістарычных фактаў і падзей, дазваляюць зрабіць высновы аб практычнай дзейнасці моладзі, камсамола, студэнцкіх аб'яднанняў.

Аналіз апублікаваных і архіўных крыніц сведчыць, што шматлікія

пытанні дзейнасці моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. застаюцца недастаткова вывучанымі. Многія дакументы і матэрыялы па ўказанай праблематыцы патрабуюць новага, аб’ектыўнага прачытання і асэнсавання.

У раздзеле 1.3 *“Метадалогія і канцэпцыя даследавання”* ахарактарызавана метадалагічная база дысертацыі, вызначана агульная канцэпцыя даследавання.

Тэарэтычнай базай выступілі прынцыпы аб’ектыўнасці, гістарызму і каштоўнаснага падыходу. У цэлым іх спалучэнне дало магчымасць прасачыць удзел моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі міжваеннага перыяду, раскрыць фактары, якія ўплывалі на развіццё гэтага працэсу, вызначыць перыяды, асаблівасці, сутнасць і прычыны гістарычных падзей і з’яў, абагуліць назапашаны сацыяльны вопыт.

У якасці непасрэднага інструментарыя былі абраны такія метады, як гісторыка-генетычны для пошука гістарычных каранёў з’яў і падзей, прасочвання іх эвалюцыі; гісторыка-параўнальны для выяўлення сутнасці і асаблівасцей вывучаемых з’яў і працэсаў, вызначэння падабенства і рознасці іх характэрных рыс; гісторыка-тыпалагічны для упарадкавання сукупнасці фактаў, падзей і з’яў на якасна аднародныя тыпы з улікам іх значымых прыкмет, ажыццяўлення перыядызацыі; гісторыка-сістэмны для вызначэння структурна-функцыянальных параметраў з’яў і працэсаў, разумення механізму іх функцыянавання; структурна-дыяхранічны для выяўлення працягласці і частаты розных падзей, дынамікі развіцця разнастайных элементаў складанай сістэмы. У цэлым з дапамогай дадзеных метадаў была вызначана тыпалогія і змест напрамкаў развіцця маладзёжнага руху і дзейнасці моладзі, а таксама прааналізаваны іх вынікі.

*Агульная канцэпцыя даследавання.* Сутнасцю маладзёжнай палітыкі ўлад Савецкай Беларусі, яе канцэптуальным зместам з’яўлялася актыўнае ўключэнне з дапамогай камсамола моладзі ў радыкальныя сацыялістычныя пераўтварэнні грамадства, эканомікі і культуры. Істотным фактарам з’явілася ўз’яднанне з БССР усходнебеларускіх тэрыторый, актыўнае будаўніцтва нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Важнай заканамернасцю практычнай рэалізацыі маладзёжнай палітыкі была наяўнасць у 1921–1939 гг. чатырох перыядаў у працэсе станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі, чатырох перыядаў ажыццяўлення ім ідэйна-палітычнай асветы сярод юнакоў і дзяўчат, чатырох перыядаў удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі, стваралі аб’ектыўныя ўмовы для заснавання і дзейнасці нацыянальных арганізацый моладзі, якія пакінулі адметны след у грамадска-палітычным жыцці краіны. Важнейшай іх асаблівасцю была арыентацыя на ўмацаванне традыцыйных нацыянальна-культурных каштоўнасцей у маладога пакалення.

Прадметам асаблівай увагі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва было

павелічэнне колькасці моладзі ў структурах дзяржаўных органаў і мясцовага самакіравання, што стварала перадумовы, неабходныя для забеспячэння сацыяльнай падтрымкі ўлады і яе пераемнасці.

Кіраўніцтва камсамола імкнулася аказваць уплыў на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення праз пашырэнне камсамольскага прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях.

Важным напрамкам дзейнасці моладзі быў удзел у сацыяльна-эканамічным будаўніцтве Савецкай Беларусі. Найбольш выніковымі яго формамі былі разгорнутае камсамолам сацыялістычнае спаборніцтва, рух перадавікоў і наватараў. Яны з’яўляліся важнымі фактарамі датэрміновага выканання пяцігадовых планавых заданняў, мадэрнізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

У мэтах фарміравання новага светапогляду падрастаючага пакалення актыўна выкарыстоўваліся адукацыя і сродкі масавай інфармацыі. Трывалая аснова для іх пранікнення ў шырокае маладзёжнае асяроддзе была закладзена праз ліквідацыю непісьменнасці.

Прафесійная падрыхтоўка кадраў масавых прафесій, спецыялістаў з сярэднеспецыяльнай і вышэйшай адукацыяй з’яўлялася стратэгічным фактарам савецкай мадэрнізацыі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця краіны.

У другой главе **“Удзел моладзі ў грамадска-палітычным жыцці краіны”** сцвярджаецца, што ў Савецкай Беларусі пад уплывам кампартыі ажыццяўлялася пабудова структур камсамола як цэнтра гуртавання моладзі краіны. Разам з тым сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні стварылі ўмовы для разгортвання нацыянальнага маладзёжнага руху, які пакінуў адметны след у грамадска-палітычным жыцці.

У раздзеле 2.1 *“Станаўленне і развіццё маладзёжных арганізацый”* адзначаецца, што дзейнасць некамуністычных структур і плыняў адцягвала значную колькасць моладзі, ускладняла пашырэнне радоў камсамола і распаўсюджванне камуністычных ідэй у маладзёжным асяроддзі. Арганізацыйнае афармленне беларускага камсамола абцяжарвалася наяўнасцю апазіцыі ў кампартыі. Кіраўніцтва краіны і маладзёжнага саюза надавала вялікую ўвагу ўмацаванню КСМБ. Гэтыя пытанні пастаянна разглядаліся на пасяджэннях партыйных і камсамольскіх органаў, іх вырашэнне адбывалася таксама з дапамогай частага склікання з’ездаў саюза.

У працэсе станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. выдзелена чатыры перыяды. Першы – 1921–1923 гг. Гэта быў час арганізацыйнага станаўлення КСМБ. Другі – 1924–1927 гг., калі адбывалася арганізацыйная разбудова саюза. Неабходнасць унясення значных змяненняў у структуру КСМБ выклікала ўзбуйненне БССР. Трэці – 1928–1933 гг. У гэты час ЛКСМБ перажываў арганізацыйны крызіс. Чацвёрты – 1934–1939 гг., калі адбываўся паступовы выхад з крызісу і пераадоленне арганізацыйных складанасцей.

У першай палове 1920-х гг. у Савецкай Беларусі дзейнічалі невялікія

беларускія маладзёжныя гурткі. Аднак улады падвяргалі праследаванням беларускія нацыянал-дэмакратычныя маладзёжныя арганізацыі. У выніку іх легальная дзейнасць была спынена яшчэ ў першай палове 1920-х гг. Праявы ж працы падобных груповак па-за прававым полем былі нешматлікімі, бо патрэбы нацыянальна-культурнага развіцця пераважнай большасці беларускай моладзі ў БССР былі забяспечаны.

Значна больш актыўна адбывалася развіццё арганізацый яўрэйскай моладзі. Да 1923 г. ЯКСМ з'яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат. Але з-за супрацьдзеяння ўлад яго праца была згорнута. Сіяніскія маладзёжныя арганізацыі былі прадстаўлены трыма групамі: сацыялістычнай (Яўрэйскі сацыялістычны саюз рабочай моладзі "Югенд Паалей-Ціон", Сіяніска-сацыялістычны саюз моладзі, Цэірэй Ціон), кансерватыўнай (Арганізацыя сіяніскай моладзі, іншыя больш дробныя групоўкі) і адукацыйна-культурнай (Гашомер-Гацаір, Гехавер, Гехалуц, Макабі). Іх колькасны склад дасягнуў найбольшых паказчыкаў у 1925 г. Аднак з-за адсутнасці адзінства ў сіяніскім руху, процідзеяння ўлад і паляпшэння эканамічнага становішча з канца 1926 г. уплыў маладзёжных сіяніскіх арганізацый слабеў, іх мясцовыя структуры распадаліся. Апошнюю беспаспяховую спробу актывізацыі працы сярод яўрэйскай моладзі сіяністы прадпрынялі напрыканцы 1920-х гг.

У раздзеле 2.2 *"Разгортванне ідэйна-палітычнай асветы"* ахарактарызаваны працэс стварэння і дзейнасці сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы ў Савецкай Беларусі. Увогуле ў ім вылучаны чатыры перыяды. Першы – 1921–1923 гг. Гэта быў час станаўлення сістэмы ідэйна-палітычнай асветы моладзі. Ён вызначаўся матэрыяльнымі складанасцямі і недахопам адпаведных кадраў. Другі – 1924–1928 гг., калі, нягледзячы на разнастайныя складанасці, адбывалася развіццё сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы, выкарыстоўваліся розныя яе формы. Трэці – 1929–1935 гг. У гэты час з-за радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў адбыўся фактычны заняпад ідэйна-палітычнай асветы моладзі. Адсутнічаў дакладны ўлік камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол. Чацвёрты – 1936–1939 гг. Ён характарызуецца арганізацыйным аднаўленнем і пашырэннем сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы, паляпшэннем яе якасці.

Кіраўніцтва кампартыі ў мэтах пашырэння камуністычнай ідэалогіі арганізоўвала ідэйна-палітычную асвету юнакоў і дзяўчат, абапіраючыся на камсамольскія структуры.

У раздзеле 2.3 *"Удзел у дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання"* зроблена выснова, што у Савецкай Беларусі кіраўніцтвам кампартыі і дзяржавы, а таксама камсамола была створана сістэма прыцягнення здольнай моладзі да працы ў структурах дзяржаўнага апарату. Але ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў з моладдзю і з камсамолам, а таксама сістэма працы камсамольцаў у органах улады і кіравання былі належным чынам арганізаваны толькі ў 1930-я гг. Нягледзячы на недапрацоўкі і складанасці, асабліва ў развіцці судовай сістэмы, удзел маладых людзей у працы структур

дзяржаўнага апарату пашыраўся, у тым ліку ў барацьбе з парушэннямі заканадаўства і бюракратызмам праз узаемадзеянне з органамі РСІ і дзейнасць “лёгкай кавалерыі”. Аднак праца “лёгкіх кавалерыстаў” характарызавалася перыядычнымі спадамі і ўздымамі. Тым не менш групы “лёгкай кавалерыі” аказалі істотную дапамогу ў барацьбе з бюракратызмам у кіруючым апараце, узняцці вытворчасці працы, паляпшэнні метадаў гаспадарання.

Разам з тым на працягу 1920-х гг. у камсамоле адсутнічала добра адпрацаваная сістэма ўдзелу ў перавыбарах Саветаў і арганізацыі працы камсамольцаў-дэпутатаў. Таму колькасць членаў камсамола ў Саветах Савецкай Беларусі вагалася. Тым не менш палітыка вылучэння камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў Саветы не спынялася і ў 1930-я гг. У Саветах расла колькасць камсамольцаў, але іх удзельная вага сярод маладых дэпутатаў скарачалася.

У раздзеле 2.4 *“Грамадска-палітычная дзейнасць”* акрэслены напрамкі ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі.

Камсамол імкнуўся аказваць актыўны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення праз арганізацыю разнастайных мерапрыемстваў і пашырэнне свайго прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях. Паступова рос інтарэс юнакоў і дзяўчат да розных грамадскіх аб’яднанняў, павялічвалася іх імкненне да ўступлення ў камсамол.

Значным напрамкам камсамольскай работы з’яўляўся ўдзел у працы прафсаюзных арганізацый. Дзейнічалі асобныя прафсаюзныя структуры для студэнцтва, якія актыўна выкарыстоўваліся для ажыццяўлення палітыкі кіраўніцтва кампартыі ў грамадскім асяроддзі.

Камсамольскія органы надавалі значную ўвагу развіццю кааператыўнага руху ў маладзёжным асяроддзі. Найбольш актыўна павялічвалася прадстаўніцтва маладога пакалення ў спажывецкім і крэдытным каапераванні, значна слабей – у сельскагаспадарчым і прамысловым. З другой паловы 1920-х гг. камітэты і ячэйкі камсамола планава пашыралі кааперацыю сярод насельніцтва. Пры гэтым структурам саюза даводзілася змагацца з заможнымі сялянамі за кантроль над вясковай кааперацыяй.

Камітэты і ячэйкі камсамола ўдзельнічалі ў барацьбе з апазіцыяй у кампартыі. Аднак у канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг. у сувязі з ажыццяўленнем у краіне радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў апазіцыйныя настроі пашырыліся не толькі сярод несаюзнай моладзі, асобных камсамольцаў, але і ахапілі цэлыя ячэйкі і нават РК ЛКСМБ. Камсамольцы-апазіцыянеры падвярглiся рэпрэсіям і напрыканцы 1930-х гг. сітуацыя ў саюзе змянілася на карысць прыхільнікаў І. Сталіна.

У трэцяй главе **“Дзейнасць моладзі па перабудове сацыяльна-эканамічнай сферы жыцця грамадства”** сцвярджаецца, што, дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці партыйных і дзяржаўных органаў, актыўнай арганізацыйнай рабоце камсамола, у Савецкай Беларусі была разгорнута праца па забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў юнакоў і дзяўчат, уключэнню іх у мадэрнізацыю эканомікі. Была падрыхтавана маладая генерацыя

кваліфікаваных працоўных у розных сферах народнай гаспадаркі.

У раздзеле 3.1 *“Вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем маладога пакалення”* падкрэслена што, нягледзячы на разнастайныя складанасці і недахопы, даволі актыўную дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў маладога пакалення і арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці эканомікі вялі структуры камсамола Савецкай Беларусі.

Нягледзячы на праявы фармалізму сацыялістычнае спаборніцтва ў асяроддзі камсамольцаў і несаюзнай моладзі ўдасканальвалася і паглыблялася, што ўмацоўвала эканоміку. У 1930-я гг. яно перарасло ў БССР у масавы рух працоўных юнакоў і дзяўчат. Пры гэтым калі спачатку пераважнай яго формай быў ударніцкі рух, то з 1935 г. – стаханаўскі.

Шмат увагі камсамол надаваў барацьбе з маладзёжным беспрацоўем праз арганізацыю юнсекцый пры біржах працы, браніраванне працоўных месцаў для падлеткаў на дзяржаўных і прыватных прадпрыемствах. Аднак толькі з ажыццяўленнем індустрыялізацыі гэта праблема ў пачатку 1930-х гг. была вырашана.

Распаўсюджанай формай прафесійнай падрыхтоўкі юнага пакалення было навучанне на вытворчасці, у асноўным у выглядзе індывідуальнага вучнёўства. Работа па навучанні юнакоў і дзяўчат на прадпрыемствах каардынавалася камсамольскімі арганізацыямі.

З удзелам структур камсамола былі створаны юнсекцыі пры цэнтральным апараце НКАЗ і мясцовых аддзелах аховы здароўя, праводзіліся медагляды працуючых юнакоў і дзяўчат, арганізоўвалася іх дыетычнае харчаванне, прапагандаваўся здаровы лад жыцця.

Таксама камсамольскія арганізацыі вялі плённую працу па ліквідацыі дзіцячай і падлеткавай беспрытульнасці, пераадоленні асацыяльных з’яў у маладзёжным асяроддзі.

У раздзеле 3.2 *“Удзел у індустрыяльным будаўніцтве”* адзначаецца, што дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці камсамольскіх структур павялічваўся прыток моладзі ў прамысловую вытворчасць Савецкай Беларусі, раслі заробкі, паляпшаліся працоўныя і жыллёва-бытавыя ўмовы, узмацнялася дысцыпліна і ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве, ініцыятыўнасць у справе пашырэння рэжыму эканоміі і рацыяналізацыі вытворчасці. Асноўная маса камсамольцаў у прамысловай вытворчасці паказвала прыклады ўзорнай працы.

Камсамольскія структуры шмат увагі надавалі арганізацыі падрыхтоўкі з ліку юнакоў і дзяўчат кваліфікаваных кадраў работнікаў для прамысловасці, асабліва шляхам прафесійнага навучання падлеткаў непасрэдна на прадпрыемствах. У выніку прафесійная падрыхтоўка і кваліфікацыя маладых рабочых паступова паляпшалася.

У раздзеле 3.3 *“Дзейнасць па мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі”* зроблена выснова, што з пачаткам новай эканамічнай палітыкі ўлады Савецкай Беларусі з дапамогай камсамола прыцягвалі маладое пакаленне да ажыццяўлення яе мерапрыемстваў на вёсцы. Камсамольцы таксама дапамагалі ўпарадкаваць землекарыстанне, развіваць калектыўныя формы вясковага

гаспадарання, укараняць у сельскую гаспадарку навуковыя рэкамендацыі і перадавы вопыт, аказвалі дапамогу ў вядзенні гаспадарак маламаёмасным сялянам і сем'ям чырвонаармейцаў, удзельнічалі ў пасяўных і хлебанарыхтоўчых кампаніях, меліярацыйных работах.

З 1923 г. пры вясковых камсамольскіх ячэйках пачалося стварэнне сельскагаспадарчых гурткоў, у працу якіх былі ўцягнуты тысячы юнакоў і дзяўчат. Павялічвалася дапамога сельскім камсамольцам з боку іх гарадскіх таварышаў.

У дзейнасці камсамола значная ўвага адводзілася развіццю калектыўных форм вясковага гаспадарання. У першай палове 1920-х гг. асноўная ўвага ў гэтай справе надавалася саўгасам. У выніку ў іх паступова павялічвалася колькасць маладых работнікаў. Пры гэтым вельмі слабым быў удзел камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў іншых калектыўных формах арганізацыі сельскай гаспадаркі.

У другой палове 1920-х гг. камсамольскія арганізацыі актывізавалі ўдзел у кампаніях хлебанарыхтовак і калектывізацыі. Аднак напрыканцы 1920-х гг. шэраг АК, РК і ячэек ЛКСМБ штучна стымулявалі калгаснае будаўніцтва, адначасова актывізавалася камсамольская праслойка, якая супрацьдзейнічала калектывізацыі.

Толькі ў пачатку 1930-х гг. пад ціскам ЦК УЛКСМ структуры ЛКСМБ у сваёй дзейнасці на вёсцы пачалі аддаваць прыярытэт працы ў калгасах. Аднак слабай заставалася ўзгодненасць дзеянняў яго камітэтаў і ячэек са структурамі кампартыі, прафсаюзаў, НКЗ БССР. Мабілізацыі камсамольцаў у калгасы, саўгасы, МТС і МТМ праводзіліся непрадумана і паспешліва, адсутнічаў паўнавартасны ўлік патрэб у запаўненні вакансій.

Аднак удзел камсамольскіх камітэтаў і ячэек у калектывізацыі паступова павялічваўся, як і працэнт камсамольцаў у калгасах і іх кіраўніцтве. Пашыралася дзейнасць арганізацый камсамола па развіцці саўгасаў, МТС і МТМ. Юнакі і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве ў сельскай гаспадарцы. Новай формай удзелу маладога пакалення ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ пры камітэтах саюза маладзёжных сельскагаспадарчых станцый.

У чацвёртай главе **"Удзел моладзі краіны ў духоўна-культурных пераўтварэннях"** вызначана, што дзякуючы мэтанакіраванай рабоце партыйных і дзяржаўных органаў, актыўнаму ўдзелу юнакоў і дзяўчат, асабліва арганізацыйнай дзейнасці камсамола, у Савецкай Беларусі была не толькі разгорнута праца па ліквідацыі непісьменнасці і стварэнні сістэмы школьнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, але і выхавана маладая генерацыя нацыянальнай інтэлігенцыі.

У раздзеле 4.1 *"Удзел у станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі"* адзначана, што дзякуючы намаганням партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і камсамольскіх органаў, у Савецкай Беларусі не толькі адбывалася ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці, але і была пабудавана сістэма школьнай

адукацыі і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Ключавую ролю ў гэтай важнай дзяржаўнай справе адыгрывала моладзь, асабліва камсамол.

Мэтанакіраваная праца партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх органаў, прывяла да значнага пашырэння падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных працоўных з ліку моладзі.

Важную ролю ў камплектаванні ССНУ і ВНУ выхадцамі з рабочых і сялян адыгрывалі рабфакі, якія ствараліся і працавалі пры актыўным удзеле камітэтаў камсамола. Аднак з пашырэннем сеткі дзесяцігадовых агульнаадукацыйных школ роля рабфакаў змяншалася.

Партыйныя, дзяржаўныя, камсамольскія і прафсаюзныя органы шмат увагі надавалі працы са студэнцкай моладдзю, рэгуляванню яе сацыяльнага і нацыянальнага складу. Пад асаблівай увагай камсамола знаходзіліся пытанні патрыятычнага выхавання і ідэйна-палітычнай асветы студэнтаў.

У раздзеле 4.2 *"Будаўніцтва нацыянальна-культурнага жыцця"* зроблена выснова, што прыярытэт у дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы сярод моладзі мела выхаванне яе з дапамогай камсамола ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і брацкай садружнасці народаў. Аднак толькі ў 1925 г. нацыянальна-культурная дзейнасць структур ЛКСМБ узмацнілася і была арганізацыйна аформлена.

Дзяржаўная палітыка беларусізацыі розных сфер жыцця грамадства знаходзіла падтрымку, дзякуючы намаганням у першую чаргу маладых беларусаў. Свайго піку беларусізацыя ў ЛКСМБ дасягнула ў 1928 г., а з 1929 г. пачала слабець, што тлумачыцца ўнутраным крызісам у саюзе з-за абвастрэння грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі і разгортваннем барацьбы з нацыянал-дэмакратамі. З 1934 г. беларусізацыя ў ЛКСМБ не ажыццяўлялася як палітычная кампанія. З сярэдзіны 1930-х гг. дзяржаўныя і грамадскія структуры БССР адышлі ад палітызацыі моўнага пытання. Тым не менш, нягледзячы на згортванне палітыкі беларусізацыі, беларуская мова захоўвала трывалыя пазіцыі ў жыцці рэспублікі, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі.

Разам з тым кампартыя і камсамол вымушаны былі ўлічваць шматнацыянальнасць жыхароў Савецкай Беларусі. У прыватнасці, сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся працы з яўрэямі, палякамі і латышамі.

Увогуле ва ўдзеле маладога пакалення Савецкай Беларусі ў нацыянальна-культурным жыцці ў міжваенны перыяд вызначаны чатыры перыяды. Першы – 1921–1924 гг. Гэта быў час актыўнай нацыянальна-культурнай працы невялікіх груп моладзі. Другі – 1925–1928 гг., калі актывізаваўся ўдзел юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве і выразна арганізацыйна аформілася нацыянальна-культурная праца ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі. Трэці – 1929–1934 гг. У гэты час з-за грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праблем адбыўся спад тэмпаў нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі. Чацвёрты перыяд – 1935–1939 гг. Ён характарызуецца развіццём нацыянальна-культурнай працы сярод

юнакоў і дзяўчат у напрамку ўмацавання інтэрнацыяналізму.

У раздзеле 4.3 *“Антырэлігійная плынь сярод моладзі”* сцвярджаецца, што толькі з 1923 г. камсамольцы Савецкай Беларусі пачалі праводзіць сістэматычную антырэлігійную агітацыю сярод насельніцтва, але пераважна фармальна. Такое становішча мала перашкаджала духавенству розных канфесій весці плённую рэлігійную працу ў маладзёжным асяроддзі. Праявы рэлігійнасці адзначаліся не толькі ў асяроддзі шараговых камсамольцаў, але і нават сярод камсамольскіх актывістаў. Увогуле ў ЛКСМБ назіраліся супрацьлеглыя ваганні ў ажыццяўленні палітыкі ў адносінах да рэлігійных канфесій. Таму ўлады зрабілі стаўку на развіццё антырэлігійнай прапаганды праз Саюз бязбожнікаў, перш за ўсё ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат. У адказ рэлігійныя канфесіі імкнуліся весці барацьбу за маладое пакаленне з дапамогай розных форм сацыяльнай і культурна-масавай работы.

Толькі з 1930 г. камсамольская антырэлігійная праца ўзмацнілася, умацавалася ўзаемадзеянне ЛКСМБ з Саюзам ваяўнічых бязбожнікаў. У выніку мэтанакіраванай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх структур у 1930-я гг. атэістычны светапогляд ахапіў большасць юнакоў і дзяўчат БССР, хаця напрыканцы вызначанага перыяду рэлігійныя ўплывы захоўваліся сярод асобных груп моладзі і нават некаторых камсамольцаў.

У раздзеле 4.4 *“Культурна-масавая работа ў маладзёжным асяроддзі”* адзначана, што ажыццяўленне культурных пераўтварэнняў уладамі Савецкай Беларусі ў асноўным трымалася на энтузіязме маладых людзей, якія ў большасці староўча іх успрымалі і актыўна прапагандавалі. Прычым кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы абапіралася ў справе культурных пераўтварэнняў на камсамол.

Разам з тым да сярэдзіны 1920-х гг. дзейнічалі і іншыя маладзёжныя культурныя асяродкі, якія ствараліся па ўласнай ініцыятыве юнакоў і дзяўчат, у тым ліку і выхадцамі з Беларусі ў іншых савецкіх рэспубліках. Многія такія аб’яднанні былі накіраваны на развіццё і папулярызацыю беларускай культуры.

Сетка камсамольскіх клубаў не магла задаволіць патрэбы моладзі. Таму камсамол ўзаемадзейнічаў у сферы культурна-масавай работы з прафсаюзамі. Найбольш эфектыўнай яе формай у маладзёжным асяроддзі былі гурткі мастацкай самадзейнасці. У 1930-я гг. актыўную культурна-асветную дзейнасць сярод насельніцтва ажыццяўлялі навучэнцы і студэнты.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы надавалі значную ўвагу арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці, у адпаведнасці з вызначанай кампартыяй ідэалогіяй, беларускай літаратуры і кінематаграфіі, нацыянальнага тэатральнага, выяўленчага і музычнага мастацтваў.

Актыўны ўдзел у выхаванні новай асобы прымалі маладыя пісьменнікі, на творчае станаўленне якіх уплываў камсамол, у першую чаргу праз Усебеларускае літаратурнае таварыства “Маладняк”. Нягледзячы на ўсе недахопы, “Маладняк” адыграў вялікую ролю ў збіранні маладзёжных літаратурных сіл і іх прафесійным росце. Але ён аказаўся няздольны

задаволіць патрэбы ўсіх маладых пісьменнікаў, што прывяло да стварэння новых літаратурных аб’яднанняў.

Структуры камсамола папулярызавалі ў маладзёжным асяроддзі тэатральнае мастацтва і кінаматаграфію. У выніку моладзь не толькі актыўна ўдзельнічала ў драматычных гуртках, самадзейных тэатральных калектывах “Сіняя блуза”, ТРАМах, але і папаўняла шэрагі прафесійных тэатральных дзеячаў і кінематаграфістаў.

Камсамольцы і несаюзная моладзь, нягледзячы на цяжкасці і складанасці, актыўна і плённа ўдзельнічалі ў развіцці нацыянальнага выяўленчага і музычнага мастацтваў. Менавіта ў 1920–1930-я гг. пачалі свой творчы шлях цэлы шэраг выдатных беларускіх мастакоў, скульптараў, спевакоў і кампазітараў.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. У 1921–1939 гг. у Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам кампартыі ажыццяўлялася пабудова структур камсамола як цэнтра гуртавання моладзі. У працэсе яго станаўлення і развіцця можна выдзяліць чатыры перыяды.

Першы перыяд ахоплівае 1921–1923 гг. Гэта быў час арганізацыйнага станаўлення КСМБ. Адпаведныя пытанні пастаянна разглядаліся на пасяджэннях партыйных і камсамольскіх органаў, іх вырашэнне адбывалася таксама з дапамогай частага склікання з’ездаў саюза. У КСМБ пераважала яўрэйская моладзь. Напрыканцы 1923 г. ён налічваў 6 паветгаркамаў, 2 ГК з 4 РК, 315 ячэек, звыш 5 тыс. членаў і кандыдатаў.

Другі перыяд ахоплівае 1924–1927 гг., калі адбывалася арганізацыйная разбудова саюза. З 1924 г. сярод яго членаў сталі пераважаць беларусы. У дзейнасці ЛКСМБ назіралася большая планавасць, павелічэнне “жывога” і скарачэнне “папяровага” кіраўніцтва. Да канца 1927 г. удалося заснаваць 12 акруговых і 111 раённых камітэтаў, 2300 ячэек, якія аб’ядноўвалі больш за 62 тыс. членаў і кандыдатаў.

Трэці перыяд ахоплівае 1928–1933 гг. У гэты час апазіцыйная барацьба у ЛКСМБ стала прычынай яго арганізацыйнага крызіса. У выніку адбылася даволі значная чыстка камсамола БССР. Некаторыя ячэйкі і РК ЛКСМБ былі распушчаны. У 1933 г. яго 111 РК налічвалі каля 5300 ячэек, якія аб’ядноўвалі каля 109 тыс. членаў і кандыдатаў. Але ў камсамоле рэспублікі значна вырасла колькасць “класава чужых” і варожых элементаў. Больш за палову камсамольцаў фактычна не ўдзельнічалі ў жыцці камсамольскіх арганізацый. З мэтай выпраўлення сітуацыі ЦК УКП(б) у 1933 г. прыпыніў далейшы колькасны рост ЛКСМБ да рашэння ЦК УЛКСМ.

Чацвёрты перыяд ахоплівае 1934–1939 гг., калі адбываўся паступовы выхад з крызісу і пераадоленне арганізацыйных складанасцей. Рашэнне аб прыпыненні колькаснага росту камсамола БССР скараціла колькасць яго

членаў амаль у 2 разы. Толькі з 1936 г. пачалося пашырэнне радоў камсамольцаў. З-за барацьбы з апазіцыяй сістэматычны характар набыла самаачыстка камсамольскіх шэрагаў ад "класава чужых" і варожых элементаў. У 1937 г. адбылася хваля выкрыцця ў ЛКСМБ "ворагаў народа". Цэлы шэраг пярвічных арганізацый саюза распаўся. Сітуацыя ў ім больш-менш стабілізавалася толькі ў канцы 1938 г. Камсамольскі актыў і кіруючыя кадры саюза амаль поўнасцю абнавіліся. У пачатку 1939 г. была выпрацавана добракіруемая сістэма камсамольскіх органаў. Камсамол БССР налічваў 5 абкамаў, 92 РК, 5 ГК і каля 11100 пярвічных арганізацый, якія аб'ядноўвалі амаль 225 тыс. членаў і кандыдатаў [1; 33; 35; 38; 43; 46].

2. Сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні стварылі ўмовы для разгортвання нацыянальнага руху моладзі, які пакінуў адметны след у грамадска-палітычным жыцці.

У першай палове 1920-х гг. у Савецкай Беларусі дзейнічалі больш за 20 беларускіх маладзёжных гурткоў. Але з-за праследаванняў улад легальныя маладзёжныя беларускія аб'яднанні некамуністычнай накіраванасці спынілі сваю дзейнасць. Праявы ж нелегальнай працы падобных груповак былі нешматлікімі, бо ўладам разам з камсамолам удалося забяспечыць патрэбы нацыянальна-культурнага развіцця пераважнай большасці маладых беларусаў.

Развіццё арганізацый яўрэйскай моладзі адбывалася па двух напрамках: камуністычным і сіяніскім. ЯКСМ да 1923 г. з'яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат. Аднак з-за супрацьдзеяння ўлад наладзіць працу ЯКСМ не ўдалося. Сярод сіяніскіх маладзёжных арганізацый Савецкай Беларусі выразна вылучаліся тры групы: сацыялістычныя, кансерватыўныя і адукацыйна-культурныя. Але ў выніку адсутнасці адзінства ў сіяніскім руху, узмацнення процідзеяння ўлад, паляпшэння эканамічнага становішча з канца 1926 г. уплыў сіяніскіх арганізацый моладзі слабеў і адбываўся распад іх мясцовых структур. Апошняя беспаспяховая спроба актывізацыі працы сярод маладых яўрэяў была прадпрынята лідарамі руху сіяністаў напрыканцы 1920-х гг.

Дзейнасць некамуністычных структур па ўмацаванні нацыянальнай свядомасці моладзі праз правядзенне адпаведных вечарын, сходаў, акцый, выданне і распаўсюджванне агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры, ускладняла пашырэнне радоў камсамола і камуністычных ідэй у маладзёжным асяроддзі. Пры гэтым шэраг арганізацый ЛКСМБ нейтральна адносіўся да нацыянал-дэмакратаў і сіяністаў, а асобныя звенні нават патрапілі пад іх уплыў. Такое становішча тлумачыцца адсутнасцю ў кіраўніцтве кампартыі і камсамола адзіных падыходаў да вырашэння нацыянальнага пытання і ўнутранай барацьбой прыхільнікаў розных ідэйных установак.

Тым не менш у выніку правядзення ўладамі палітыкі ліквідацыі альтэрнатыўных аб'яднанняў моладзі камсамол з другой паловы 1920-х гг. з'яўляўся ў БССР адзінай афіцыйнай маладзёжнай арганізацыяй [1; 2; 11; 13; 49].

3. Кіраўніцтва кампартыі арганізоўвала ідэйна-палітычную асвету

юнакоў і дзяўчат, абапіраючыся на камсамольскія структуры. Усяго за азначаны перыяд, па нашых падліках, яны правялі 28 адпаведных значных акцый і кампаній. Увогуле ў арганізацыі ідэйна-палітычнай асветы моладзі Савецкай Беларусі можна вылучыць чатыры перыяды.

Першы ахоплівае 1921–1923 гг., калі адбывалася станаўленне сістэмы маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы. Яе пашырэнне стрымлівалася агульным невысокім узроўнем адукацыі падрастаючага пакалення, недахопам кваліфікаваных кадраў, спецыяльнай літаратуры і фінансавых сродкаў. У канцы 1923 г. у Савецкай Беларусі дзейнічалі больш за 200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол. Усяго ідэйна-палітычнай вучобай было ахоплена каля 50 % камсамольцаў і каля 14 тыс. несаюзных юнакоў і дзяўчат.

Другі прыпадае на 1924–1928 гг., калі, нягледзячы на складанасці, адбывалася развіццё сістэмы ідэйна-палітычнай асветы. Камітэты і ячэйкі камсамола паступова актывізавалі гэту працу. У 1927/28 н. г. амаль усе камсамольцы займаліся ў палітшколах і палітгуртках. У 1928 г. у БССР працавалі каля 1500 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, дзе навучаліся каля 90 % камсамольцаў і больш за 37 тыс. несаюзных маладых людзей.

Трэці перыяд прыходзіцца на 1929–1935 гг., калі з-за арганізацыйнага крызісу ўнутры ЛКСМБ сетка маладзёжнай ідэйна-палітычнай асветы ў большасці раёнаў была развалена. У 1935 г. у ёй навучаліся толькі каля 23 % камсамольцаў і крыху больш за 7 тыс. несаюзных юнакоў і дзяўчат.

Чацвёрты перыяд ахоплівае 1936–1939 гг. і характарызуецца арганізацыйным аднаўленнем і пашырэннем сістэмы ідэйна-палітычнай асветы, паляпшэннем яе якасці. Напрыканцы 1930-х гг. была створана разгалінаваная і добракіруемая сістэма ідэйна-палітычнай асветы маладога пакалення. Ёй была ахоплена большасць моладзі БССР. Так, у 1939 г. працавалі каля 8200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, у якіх навучаліся каля 100 % камсамольцаў і каля 40 тыс. несаюзных юнакоў і дзяўчат [1; 2; 17; 41].

4. Прадметам асаблівай увагі кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы, а таксама камсамола было пашырэнне ў структурах дзяржаўных органаў колькасці камсамольцаў і моладзі, што забяспечвала устойлівасць улады і яе эвалюцыйную пераемнасць. Разам з тым узаемадзеянне органаў улады і кіравання з моладдзю і з камсамолам, а таксама сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў у іх былі належным чынам арганізаваны толькі ў 1930-я гг. Але ўдзел маладых людзей у працы структур дзяржаўнага апарату пашыраўся. Калі ў пачатку 1920-х гг. яны складалі ўім каля 5 %, то напрыканцы ўказанага перыяду – каля 30 %.

Юнакі і дзяўчаты таксама ўдзельнічалі ў барацьбе з парушэннямі законаў і бюракратызмам праз узаемадзеянне з органамі РСІ і дзейнасць “лёгкай кавалерыі”.

Назіралася тэндэнцыя павелічэння прадстаўніцтва моладзі ў Саветах. Аднак на працягу 1920-х гг. у камсамоле Савецкай Беларусі адсутнічала добра адпрацаваная і зладжаная сістэма ўдзелу ў перавыбарах Саветаў і арганізацыі

працы камсамольцаў-дэпутатаў. Колькасць членаў камсамола ў Саветах вагалася, бо часта камсамольскія ячэйкі выступалі неарганізавана і не мелі яшчэ трывалай падтрымкі сярод насельніцтва. У 1930-я гг. камсамольскія арганізацыі дэманстравалі высокую актыўнасць у час выбараў. У Саветах павялічвалася колькасць членаў ЛКСМБ, але іх удзельная вага сярод маладых дэпутатаў скарачалася. Такое становішча сведчыць аб наяўнасці сістэмнай дзяржаўнай палітыкі па прыцягненні здольнай моладзі да працы ў Саветах незалежна ад яе прыналежнасці да камсамола. Так, калі ў пачатку 1920-х гг. маладыя дэпутаты ў іх складалі каля 10 %, то напрыканцы ўказанага перыяду – каля 40 % [1; 2; 26; 40; 50; 51].

5. З мэтай актыўнага ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення структуры камсамола праводзілі разнастайныя мерапрыемствы і павялічвалі шыралі прадстаўніцтва сваіх членаў у грамадскіх арганізацыях. Але да другой паловы 1930-х гг. адсутнічала сістэма працы камсамольцаў у грамадскіх структурах, назіраўся фармальны падыход да гэтай справы.

Значным кірункам камсамольскай дзейнасці з’яўляўся ўдзел у прафсаюзным руху. Пры гэтым асаблівая ўвага надавалася працы са студэнцтвам. Аднак, нягледзячы на ўсё больш узрастаючую актыўнасць моладзі ў прафсаюзным руху, камсамольцамі з’яўляліся менш за палову маладых членаў прафсаюзаў, што сведчыць аб большай у параўнанні з камсамолам іх прыцягальнасці для юнакоў і дзяўчат. Дзякуючы дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх арганізацый, колькасць моладзі ў прафсаюзах вырасла з некалькіх тысяч у пачатку 1920-х гг. да больш за 100 тыс. у канцы 1930-х гг.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы таксама надавалі значную ўвагу развіццю кааператыўнага руху ў маладзёжным асяроддзі. Актыўнасць моладзі ў кааператыўным руху паступова расла. Пры гэтым структурам камсамола даводзілася весці барацьбу з заможнымі сялянамі за кантроль над кааператыўным рухам на вёсцы. У 1930-я гг. удзел моладзі ў кааперацыі развіваўся ў асноўным пад патранажам ЛКСМБ.

За вызначаны перыяд структурамі камсамола Савецкай Беларусі былі праведзены 65 значных грамадска-палітычных кампаній. Нягледзячы на праявы фармалізму і адсутнасць вопыту, мэтанакіраваная праца камсамольскіх органаў павялічвала інтарэс юнакоў і дзяўчат да грамадскіх аб’яднанняў, іх імкненне да ўступлення ў камсамол, што садзейнічала сацыялізацыі маладога пакалення. У выніку ЛКСМБ стаў галоўнай арганізуючай сілай маладзёжнага грамадска-палітычнага жыцця БССР. Большасць камсамольцаў і несаюзнай моладзі падтрымлівалі палітыку партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва [1; 2; 3; 4; 7; 9; 10; 16; 22; 29; 31; 34; 36; 44; 47; 48].

6. З пачатку 1920-х гг. камсамольскія структруры вялі дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў маладога пакалення і арганізацыі яго ўдзелу ў развіцці эканомікі. Распаўсюджанай формай прафесійнай падрыхтоўкі юнакоў і дзяўчат было навучанне на вытворчасці, якое

каардынавалася камсамолам. Аднак да сярэдзіны 1930-х гг. тэмпы яго працы адставалі ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, большасць маладых працоўных не мела кваліфікацыі ці была малакваліфікаванай, не ўдавалася цалкам забяспечыць сацыяльна-эканамічныя правы юнакоў і дзяўчат. Разам з тым разгорнутае ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі сацыялістычнае спаборніцтва актыўна ўдасканальвалася і пашыралася, што ўмацоўвала эканоміку. У 1930-я гг. яно перарасло ў БССР у масавы рух стаханаўцаў, перадавікоў і наватараў, што стала важным фактарам датэрміновага выканання рэспублікай пяцігадовых планавых заданняў.

Структуры камсамола вялі барацьбу з беспрацоўем моладзі. Але толькі з пашырэннем індустрыялізацыі гэта праблема ў пачатку 1930-х гг. была вырашана. Камсамольскія арганізацыі надавалі значную ўвагу маніторынгу стану здароўя маладых працоўных, прапагандзе здаровага ладу жыцця, змагаліся з асацыяльнымі з’явамі ў маладзёжным асяроддзі. У выніку ў канцы 1930-х гг. злачыннасць і асацыяльныя з’явы сярод моладзі прыкметна зменшыліся.

З пачаткам НЭПа ўлады актыўна прыцягвалі да ажыццяўлення яго мерапрыемстваў на вёсцы камсамол і несаюзную моладзь. Камсамольцы таксама дапамагалі ўпарадкаваць землекарыстанне, аказвалі ўсебаковую дапамогу маламаёмасным сялянам, а’ктыўна ўдзельнічалі ў пасяўных і хлебанарыхтоўчых кампаніях, меліярацыйных работах, укаранялі ў сельскую гаспадарку навуковыя рэкамендацыі і перадавы вопыт. У працу сельскагаспадарчых гурткоў былі ўцягнуты тысячы маладых людзей.

У дзейнасці камсамола значная ўвага адводзілася развіццю калектыўных форм вясковага гаспадарання. Спачатку асноўная ўвага ў гэтай справе надавалася саўгасам. Напрыканцы 1920-х гг. у ЛКСМБ выразна праявіліся супрацьлеглыя падыходы ў адносінах да правядзення калектывізацыі. Шэраг АК, РК і ячэек саюза штучна стымулявалі калгаснае будаўніцтва. Пры гэтым унутры камсамольскіх арганізацый актывізавалася праслойка, якая супрацьдзейнічала калектывізацыі. Толькі ў 1930-я гг. структуры ЛКСМБ у сваёй дзейнасці на вёсцы пачалі аддаваць прыярытэт працы ў калгасах. Пашыралася дзейнасць арганізацый камсамола па развіцці саўгасаў, МТС і МТМ. Новай формай удзелу юнакоў і дзяўчат ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя пры камсамольскіх камітэтах маладзёжных сельскагаспадарчых станцый.

Па нашых падліках, за перыяд, які разглядаецца намі, камсамол Савецкай Беларусі арганізаваў цэлы шэраг значных акцый: 80 – па забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў маладога пакалення; 15 – па арганізацыі падрыхтоўкі на прадпрыемствах і ва ўстановах работнікаў з ліку юнакоў і дзяўчат; 23 – па барацьбе з беспрацоўем моладзі; 30 – па ахове здароўя маладых працоўных; 46 – па пераадоленні асацыяльных з’яў у маладзёжным асяроддзі; 184 – накіраваныя на мадэрнізацыю айчыннай прамысловасці і забеспячэнне актыўнага ўдзелу моладзі ў індустрыяльным будаўніцтве (з іх толькі 25 не дасягнулі пастаўленых мэт); 229 – накіраваных

на мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі і забеспячэнне актыўнага ўдзелу ў гэтым працэсе маладога пакалення (з іх 161 была рэалізавана, хоць і з рознай ступенню паспяховасці, і толькі 68 пацярпелі няўдачу).

У цэлым юнакі і дзяўчаты адыгралі істотную ролю ў паскарэнні прамысловага развіцця, а таксама з'яўляліся важнай апорай улад у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і ўнеслі вялікі ўклад у гэты працэс [1; 5; 6; 8; 12; 14; 15; 18; 19; 20; 21; 23; 27; 28; 30; 32; 39; 42; 45].

7. Камсамольскія структуры, а таксама рабфакаўцы і студэнты разгарнулі з пачатку 1920-х гг. працу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. У выніку ўжо ў другой палове 1920-х гг. большасць моладзі БССР з'яўлялася пісьменнай. Пры ўдзеле юнакоў і дзяўчат умацавалася таварыства "Прэч няпісьменнасьць". Калі ў пачатку 1920-х гг. штогадовая колькасць людзей, навучаных камсамольцамі, рабфакаўцамі і студэнтамі пісьменнасці, лічылася сотнямі, то напрыканцы вызначанага перыяду – сотнямі тысяч. Сярод маладога пакалення непісьменнасць была амаль цалкам ліквідавана. З пачатку 1920-х гг. камсамольцы ўдзельнічалі ў стварэнні агульнаадукацыйных школ, у падрыхтоўцы і ажыццяўленні ўсеагульнага абавязковага навучання. З 1927 г. моладзь ужо складала большасць сярод настаўнікаў БССР. Камсамольцы аказвалі дапамогу ва ўзняцці агульнаадукацыйнага ўзроўню маладых працоўных праз пашырэнне сеткі ШРМ і ШСМ (ШКМ), а таксама праз арганізацыю вячэрняй адукацыі. Паступова ўзмацнялася ўзаемадзеянне камсамольцаў і настаўнікаў, удзел камсамольскіх арганізацый ва ўнутрышкольных справах. Па нашых падліках, структуры камсамола Савецкай Беларусі на працягу перыяду, што разглядаецца, правялі 28 значных акцый па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і 77 – па развіцці школьнай адукацыі.

Камсамольскія камітэты і ячэйкі ўдзельнічалі ў арганізацыі падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў працоўных ва ўстановах пачатковай прафесійнай адукацыі. Мэтанакіраваная праца партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх органаў давала станоўчыя вынікі. Калі ў пачатку 1920-х гг. ва ўстановах пачатковай прафесійнай адукацыі навучаліся тысячы юнакоў і дзяўчат, то напрыканцы вызначанага перыяда – дзясяткі тысяч.

Пры ўдзеле камітэтаў камсамола ствараліся і працавалі рабфакі. Падборам і дэлегаваннем моладзі на рабфакі, у ССНУ і ВНУ займаліся структуры кампартыі, камсамола і прафсаюзаў з мэтай забеспячэння пераважна рабоча-сялянскага складу студэнтаў. З 1922 г. перыядычна праводзіліся чысткі студэнцтва на аснове класавага падыходу. Пры гэтым сярод прынятых на рабфакі, у ССНУ і ВНУ ў 1920-я гг. па сацыяльным паходжанні пераважалі сяляне і так званыя іншыя сацыяльныя групы. Толькі з пачатку 1930-х гг. у студэнцкім асяроддзі дамінавалі выхадцы з рабочых і сялян. Але з адменай сацыяльных абмежаванняў на другое па колькасці месца выйшлі студэнты нерабоча-сялянскага паходжання. У першай палове 1920-х гг. у студэнцкім асяроддзі пераважалі яўрэі. Аднак у выніку ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі паступова сярод студэнтаў беларусы пачалі складаць

большасць. Дзякуючы мэтанакіраваным захадам улад, дзейнасці камсамольскіх арганізацый паляпшалася якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

У цэлым, намі падлічана, што камсамольскія структуры Савецкай Беларусі на працягу вызначанага перыяду правялі 77 значных акцый, накіраваных на развіццё і ўмацаванне сістэмы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі [1].

8. Прыярытэт у дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы сярод моладзі мела выхаванне яе ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і брацкай садружнасці народаў. Ва ўдзеле юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным жыцці ў міжваенны перыяд можна вылучыць чатыры перыяды. Першы ахоплівае 1921–1924 гг. і вызначаецца актыўнай нацыянальна-культурнай працай невялікіх груп моладзі. З 1923 г. і кіраўніцтва КСМБ звярнула ўвагу на ажыццяўленне беларусізацыі. Другі прыпадае на 1925–1928 гг. і характарызуецца актывізацыяй удзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве, выразным арганізацыйным афармленнем нацыянальна-культурнай працы ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі. Пры гэтым сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся рабоце з яўрэямі, палякамі і латышамі. У 1928 г. беларусізацыя ў камсамоле БССР дасягнула свайго піку. Трэці прыходзіцца на 1929–1934 гг. і адметны спадам тэмпаў нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі з-за ўзмацнення барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. У маладзёжным асяроддзі назіраўся рост праяў шавінізму, антысемітызму і нацыянальнай адасобленасці. Адбыўся адыход ад ажыццяўлення спецыяльнай нацыянальна-культурнай працы ў асяроддзі моладзі нацыянальных меншасцей. Беларусізацыя ў ЛКСМБ з 1929 г. пачала слабець і з 1934 г. не ажыццяўлялася як палітычная кампанія. Чацвёрты ахоплівае 1935–1939 гг. і вызначаецца развіццём нацыянальна-культурнай працы сярод юнакоў і дзяўчат у напрамку ўмацавання інтэрнацыяналізму. Пры гэтым беларуская мова захоўвала дастаткова трывалыя пазіцыі ў маладзёжным асяроддзі. У цэлым, нашы падлікі сведчаць, што камсамольскія структуры Савецкай Беларусі ў разгледжаны перыяд правялі 105 значных акцый, накіраваных на развіццё нацыянальна-культурнага жыцця і ўкараненне інтэрнацыяналізму ў маладзёжным асяроддзі.

Разам з тым у камсамоле Савецкай Беларусі назіраліся супрацьлеглыя ваганні ў ажыццяўленні палітыкі ў адносінах да рэлігійных канфесій. Такое становішча дазваляла духавенству весці плённую рэлігійную працу ў маладзёжным асяроддзі. Пік яго даволі паспяховай дзейнасці па пашырэнні ўплыву на моладзь прыпаў на 1928–1929 гг. Праявы рэлігійнасці адзначаліся не толькі ў асяроддзі шараговых камсамольцаў, але і сярод актывістаў саюза. Толькі з 1930 г. камсамольская антырэлігійная праца пачала ўзмацняцца. Пры падтрымцы камсамола колькасна вырас і пашырыў дзейнасць СВБ. Аднак у другой палове 1930-х гг. антырэлігійная праца ЛКСМБ зноў аслабела. Тым не менш у выніку мэтанакіраванай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх структур у 1930-я гг. атэістычны светапогляд ахапіў большасць

юнакоў і дзяўчат Савецкай Беларусі, як мінімум у форме дэкларатыўнага праяўлення. Але напрыканцы вызначанага перыяду рэлігійныя ўплывы захоўваліся сярод асобных груп моладзі і нават некаторых камсамольцаў. У адпаведнасці з нашымі падлікамі, камсамольскія структуры за ўвесь разгледжаны перыяд правялі 35 значных акцый і кампаній, накіраваных на пашырэнне антырэлігійнай плыні ў маладзёжным асяроддзі.

Улады праводзілі палітыку па ўключэнні моладзі ў ажыццяўленне змен у культурным будаўніцтве ў адпаведнасці з камуністычнай ідэалогіяй і абапіраліся ў гэтай справе перш за ўсё на камсамол. Культурныя пераўтварэнні ў асноўным трымаліся на энтузіязме маладых людзей. Акрамя камсамольскіх да сярэдзіны 1920-х гг. дзейнічалі і іншыя маладзёжныя культурныя асяродкі, якія ствараліся па ініцыятыве юнакоў і дзяўчат. Усяго, па нашых падліках, камсамольскія структуры правялі 62 значныя акцыі і кампаніі, накіраваныя на пашырэнне грамадска-культурнай працы ў асяроддзі моладзі [1; 7; 24; 25; 37; 53; 54; 55].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца для далейшай распрацоўкі праблем развіцця беларускай дзяржаўнасці, грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных адносін у гісторыі Беларусі. Прыведзеныя ў дысертацыі вывады важныя для тэарэтычнага асэнсавання ролі моладзі ў гэтых працэсах.

Атрыманыя дысертантам вынікі маюць практычнае значэнне для перспектыўнай распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржавы, могуць быць запатрабаваны органамі ўлады і кіравання ў працэсе далейшага ўдасканалення і развіцця маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Вывады і канкрэтны фактлагічны матэрыял праведзенага даследавання маюць патэнцыял практычнага выкарыстання ў справе падрыхтоўкі падручнікаў, вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў і навучэнцаў, пры распрацоўцы і ўдасканаленні курсаў, спецкурсаў і факультатываў па гісторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці, маладзёжнага руху, а таксама дысцыплін спецыялізацыі. Вынікі даследавання з'яўляюцца важнымі для знаёмства шырокай грамадскасці з гісторыяй маладзёжнага руху ў нашай краіне.

Перспектыўнымі напрамкамі далейшага даследавання праблемы з'яўляюцца ўдзел моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве ў БССР 1945–1991 гг., а таксама ў Рэспубліцы Беларусь.

Матэрыялы дысертацыі ўкаранёны ў адукацыйны працэс у Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава, Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Еўфрасінні Полацкай, Універсітэце грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі

Беларусь для паглыбленага вывучэння гісторыка-гуманітарных дысцыплін навучэнцамі, арганізацыі іх самастойнай кіруемай работы, выкананні імі навукова-даследчай працы; пры актуалізацыі электроннага вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя дзяржавы і права Беларусі”; пры чытанні лекцый, правядзенні семінарскіх заняткаў, арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбных дысцыплінах “Гісторыя Беларусі”, “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі”, “Гісторыя навейшага часу”, “Гісторыя Расіі і Украіны”, а таксама ў працэсе падрыхтоўкі і выканання курсавых і дыпломных работ студэнтамі. Гэта пацверджана адпаведнымі “Актамі аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання” ад 21.10.2020 г., 26.01.2022 г., 18.05.2022 г., 02.06.2022 г., 11.10.2022 г., 11.11.2022 г.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Манаграфіі

1. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 730 с.

## Раздзелы ў калектыўных манаграфіях

2. Данилович, В. В. Участие молодёжи в укреплении белорусского государства / В. В. Данилович // История белорусской государственности : в 5 т. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2019. – Т. 3 : Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома: В. Г. Мазец, Н. В. Смехович, С. А. Третьяк. – С. 409–485.

## Артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

3. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2007. – № 2. – С. 8–12.
4. Даніловіч, В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь у пачатку 1920-х гг. / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 23. – С. 15–21.
5. Данилович, В. Молодёжь в социально-экономической жизни Советской Социалистической Республики Беларусь на начальном этапе новой экономической политики / В. Данилович // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 24. – С. 94–100.
6. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь напярэдадні беларусізацыі / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2009. – № 3. – С. 62–70.
7. Даніловіч, В. В. Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці Савецкай Беларусі ў пачатку 1920-х гг. / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2010. – № 3. – С. 58–66.
8. Даніловіч, В. В. Моладзь у кааператыўным руху Савецкай Беларусі 20–30-х гадоў XX стагоддзя / В. В. Даніловіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2015. – № 1. – С. 2–7.
9. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў грамадскім жыцці Савецкай Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2015. – № 1. – С. 31–38.

10. Даніловіч, В. В. Арганізацыі беларускай моладзі Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 2. – С. 65–74.
11. Даніловіч, В. В. Уплыў асацыяльных з’яў на моладзь Савецкай Беларусі і барацьба з ім (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманітар. навукі. – 2015. – № 2. – С. 23–34.
12. Даніловіч, В. В. Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі (1921–1929 гг.) / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2015. – № 2. – С. 54–63.
13. Даніловіч, В. В. Маладзёжнае беспрацоўе ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гады і барацьба з ім / В. В. Даніловіч // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2015. – № 10. – С. 3–14.
14. Даніловіч, В. В. Маніторынг стану здароўя моладзі і арганізацыя мерапрыемстваў па яе аздараўленні ў Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сб. науч. тр. / Витеб. гос. ун-т. – Витебск, 2015. – Т. 20. – С. 80–88.
15. Даніловіч, В. В. Моладзь у прафсаюзным руху Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2015. – Вып. 30. – С. 161–170.
16. Даніловіч, В. В. Арганізацыя палітычнай асветы моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1928 гг. / В. В. Даніловіч // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та. Сер. А, Гуманітар. навукі. – 2016. – № 1. – С. 14–20.
17. Даніловіч, В. В. Моладзь у сельскагаспадарчай вытворчасці Савецкай Беларусі (1921–1927 гг.) / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2016. – № 1. – С. 29–39.
18. Даніловіч, В. В. Моладзь у сельскагаспадарчай вытворчасці БССР у 1930-я гг. / В. В. Даніловіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2016. – № 1. – С. 46–58.
19. Даніловіч, В. В. Моладзь у сельскай гаспадарцы Савецкай Беларусі ў час разгортвання масавай калектывізацыі (1928–1930 гг.) / В. В. Даніловіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2016. – № 1. – С. 11–21.
20. Даніловіч, В. В. Моладзь у прамысловасці Савецкай Беларусі ў гады ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі / В. В. Даніловіч // Изв. Гомел. гос. ун-та. Гуманитар. науки: история, филология, философия. – 2016. – № 4. – С. 30–35.
21. Даніловіч, В. Удзел моладзі ў палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2016. – Вып. 31. – С. 87–99.
22. Даніловіч, В. В. Моладзь у індустрыяльным будаўніцтве БССР (1928–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2017. – № 1. – С. 33–48.
23. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці Савецкай Беларусі (1921–1939) / В. В. Даніловіч // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. – 2018. – № 4. – С. 19–27.

24. Даніловіч, В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальнай працы сярод польскай моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2019. – Вып. 34. – С. 115–119.

**Артыкулы ў іншых навуковых выданнях, якія адпавядаюць п. 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь**

25. Данилович, В. В. Молодёжь в органах власти и управления Советской Беларуси 20-х – 30-х годов XX века / В. В. Данилович // Изв. Самар. науч. центра Рос. акад. наук. – 2014. – № 3. – С. 459–467.
26. Данилович, В. В. Социальное положение молодёжи Советской Беларуси в 1921–1939 гг. / В. В. Данилович // Человеч. капитал. – 2015. – № 1. – С. 14–19.
27. Данилович, В. В. Молодёжь в экономической жизни Советской Беларуси в 1921–1939 гг. / В. В. Данилович // Ист. журн: науч. исслед. – 2015. – № 6. – С. 778–790.

**Артыкулы ў іншых перыядычных навуковых выданнях**

28. Данилович, В. В. Молодёжь и общественно-политическая жизнь Советской Социалистической Республики Беларусь начала 1920-х годов / В. В. Даніловіч // Ист. пространство. Проблемы истории стран СНГ. – 2008. – № 1-4. – С. 139–149.
29. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў сацыяльна-эканамічным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Весн. Палес. дзярж. ун-та. Сер. грамад. і гуманітар. навук. – 2009. – № 1. – С. 37–41.
30. Данилович, В. В. Начало НЭПа и новое поколение в Советской Беларуси (проблема определения ориентиров) / В. В. Данилович // Европейские сравнительно-исторические исследования / Ин-т всеобщ. истории Рос. акад. наук. – М., 2010. – Вып. 3 : История и сообщества. – С. 342–352.
31. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў прафсаюзным руху Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2015. – № 2. – С. 4–11.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і іншых выданнях**

32. Даніловіч, В. В. Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: М. М. Забаўскі [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 177–182.
33. Даніловіч, В. В. Структура і склад КСМБ у 1923 г. / В. В. Даніловіч // Актуальныя пытанні сучаснай навукі : зб. навук. пр. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 15–18.

34. Даніловіч, В. Моладзь у спажывецкай кааперацыі Савецкай Беларусі ў 1920–1930-я гады / В. В. Даніловіч // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 387–392.

35. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі 1921–1939 гг.: гістарыяграфія праблемы / В. В. Даніловіч // Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 29–46.

36. Данилович, В. В. Общественная деятельность молодежи Советской Беларуси межвоенного периода / В. В. Данилович // Столетие Революции 1917 года в России : науч. сб. : в 2 ч. / Моск. гос. ун-т [и др.] ; отв. ред. И. И. Тучков. – М., 2018. – Ч. 2 : Революция 1917 года в России – в истории и историографии стран ближнего зарубежья. – С. 58–77.

37. Даніловіч, В. В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальнай працы сярод яўрэйскай моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я – пачатку 1930-х гг. / В. В. Даніловіч // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Каваленя, І. Ф. Кітурка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2021. – С. 19–23.

## Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

38. Даніловіч, В. В. Гістарыяграфія маладзёжнага руху Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2003 г. : у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: У. В. Тугай (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – Ч. 2. – С. 414–418.

39. Даніловіч, В. В. Сацыяльна-эканамічнае становішча моладзі ССРБ у сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI стагоддзя : матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 6 снеж. 2002 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; пад навук. рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. – Мінск, 2003. – С. 119–121.

40. Даніловіч, В. В. Дзейнасць КСМБ па ўмацаванні дзяржаўнасці ССРБ у сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18–19 крас. 2003 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; навук. рэд.: П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 81–82.

41. Даніловіч, В. В. Палітыка-ідэалагічныя фактары фарміравання грамадзянскай культуры моладзі Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Формирование гражданской культуры молодёжи в условиях интеграции Республики Беларусь в европейское образовательное пространство : материалы междунар. науч. конф., Витебск,

8–9 дек. 2004 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: Н. А. Ракова (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2004. – С. 41–44.
42. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай маладзёжнай палітыкі на Мазыршчыне ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гомельщина в событиях, 1917–1945 гг. : материалы науч.-практ. конф., Гомель, 27 нояб. 2007 г. / НАН Беларуси [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Гомель, 2007. – С. 67–69.
43. Даніловіч, В. В. Метадалагічныя асаблівасці вывучэння маладзёжнага руху Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 окт. 2006 г. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 23–24.
44. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Мінска пачатку 1920-х гадоў / В. В. Даніловіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7–9 верас. 2007 г. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 284–290.
45. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай маладзёжнай палітыкі на Гарадоччыне ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра : матэрыялы I Гарадоц. краязн. чытанняў, Гарадок, 26 кастр. 2007 г. / Гарадоц. раён. краязн. музей ; рэдкал.: А. М. Дарафеева (адк. рэд.), Т. М. Іванова, Ю. Э. Самавічуце. – Гарадок, 2008. – С. 59–62.
46. Даніловіч, В. В. Становішча Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Октябрь 1917 года в судьбе мировой цивилизации (к 90-летию Октябрьской революции) : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2 ноября 2007 г. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: М. П. Костюк (гл. ред.) [и др.]. – Мінск, 2008. – С. 221–224.
47. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў грамадскім жыцці ССРБ у пачатку 1920-х гг. / В. В. Даніловіч // Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР) : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 18 снеж. 2008 г. / НАН Беларусі [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 72–76.
48. Даніловіч, В. В. Моладзь Полаччыны і Віцебшчыны ў грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. – Наваполацк, 2016. – Ч. 1. – С. 14–21.
49. Даніловіч, В. В. Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі на Гомельшчыне ў 1921–1929 гг. / В. В. Даніловіч // Проблемы рационального использования природных ресурсов и устойчивое развитие Полесья : сб. докл. междунар. науч. конф., Минск, 14–17 сент. 2016 г. : в 2 т. / НАН Беларуси [и др.] ; редкол.:

В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2016. – Т. 2. – С. 506–509.
50. Даніловіч, В. В. Моладзь у органах дзяржаўнага кіравання Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Белорусская государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2017. – С. 91–94.
51. Данилович, В. В. Участие молодёжи в процессе укрепления белорусской советской государственности (1921–1939 гг.) / В. В. Данилович // 1917 год у гістарычных лёсах Беларусі : зб. матэрыялаў міжнар. навук. канф., Мінск, 30 лістап. – 1 снеж. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 209–215.
52. Данилович, В. В. Деятельность комсомола Советской Беларуси в сфере культуры (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Российская молодежь: от комсомола к современным формам политической организации : материалы межрегион. науч.-практ. конф., Новосибирск, 30–31 окт. 2018 г. / Ин-т истоии Сиб. отд-ния Рос. акад. наук [и др.] ; редкол.: В. И. Козодой [и др.]. – Новосибирск, 2018. – С. 40–51.
53. Даніловіч, В. В. Моладзь у нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве БССР у 1920-я гады / В. В. Даніловіч // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 лістап. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 11–20.
54. Даніловіч, В. В. Моладзь у рэлігійным жыцці савецкага Беларускага Падзвіння (1921–1939 гг.) [Электронны рэсурс] / В. В. Даніловіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полац. дзярж. ун-та, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).
55. Даніловіч, В. В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальна-культурнай працы сярод латышскай моладзі савецкай Беларусі ў 1920-я гг. / В. В. Даніловіч // От Версаля и Веймара до образования двух Германий (ФРГ и ГДР), 1919–1949 гг.: актуальные вопросы исторической германистики, отечественной и всеобщей истории, геополитики и международных отношений, социально-гуманитарных наук и права : материалы междунар. науч. конф., Витебск, 3–4 окт. 2019 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: В. А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2019. – С. 205–206.

# РЭЗЮМЭ


Даніловіч Вячаслаў Віктаравіч

**Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.)**

**Ключавыя словы:** Савецкая Беларусь, моладзь, маладзёжны рух, маладзёжныя арганізацыі, камсамол, грамадска-палітычнае жыццё, сацыяльна-эканамічнае развіццё, культура

**Мэта даследавання:** раскрыццё зместу і форм удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг., устанаўленне важнейшых перыядаў, дасягненняў і недахопаў у дзейнасці маладзёжных арганізацый.

**Метады даследавання:** аналіз і сінтэз, параўнанне і абагульненне, індукцыя і дэдукцыя; гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, структурна-дыяхранічны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню ў гістарыяграфіі комплексна раскрыты працэс удзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі у 1921–1939 гг.; выяўлены перыяды станаўлення і развіцця камсамола; адлюстраваны асаблівасці нацыянальнага маладзёжнага руху; вызначаны характэрныя рысы ўдзелу моладзі ў дзейнасці дзяржаўных органаў і Саветаў; раскрыты формы і выяўлены перыяды ідэйна-палітычнай асветы маладога пакалення, а таксама перыяды і асаблівасці яго ўдзелу ў нацыянальна-культурным жыцці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навукова-даследчай працы пры падрыхтоўцы дыпломных работ, магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Будуць карысныя пры распрацоўцы і ўдасканаленні курсаў, спецкурсаў і факультатываў па гісторыі Беларусі, беларускай дзяржавы, айчыннага маладзёжнага руху. Маюць практычнае значэнне для перспектыўнай распрацоўкі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці, могуць быць запатрабаваны органамі ўлады і кіравання ў працэсе далейшага ўдасканалення і развіцця маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**Галіна выкарыстання:** гісторыя Беларусі, гісторыя беларускай дзяржаўнасці, палітычная гісторыя, сацыяльная гісторыя, эканамічная гісторыя, гісторыя культуры, адукацыя.

## РЕЗЮМЕ

Данилович Вячеслав Викторович

**Молодёжь в общественно-политическом, социально-экономическом и культурном строительстве Советской Беларуси (1921–1939 гг.)**

**Ключевые слова:** Советская Беларусь, молодёжь, молодёжное движение, молодёжные организации, комсомол, общественно-политическая жизнь, социально-экономическое развитие, культура

**Цель исследования:** раскрытие содержания и форм участия молодёжи в общественно-политическом, социально-экономическом и культурном строительстве Советской Беларуси в 1921–1939 гг., установление важнейших периодов, достижений и недостатков в деятельности молодёжных организаций.

**Методы исследования:** анализ и синтез, сравнение и обобщение, индукция и дедукция; историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический, историко-системный, структурно-диахронический.

**Полученные результаты и их новизна:** впервые в историографии комплексно раскрыт процесс участия молодёжи в общественно-политической, социально-экономической и культурной жизни Советской Беларуси в 1921–1939 гг.; выявлены периоды становления и развития комсомола; отражены особенности национального молодёжного движения; определены характерные черты участия молодёжи в деятельности государственных органов и Советов; раскрыты формы и выявлены периоды идейно-политического просвещения молодого поколения, а также периоды и особенности участия молодёжи в национально-культурной жизни.

**Рекамендации по использованию.** Результаты исследования могут использоваться в научно-исследовательской работе при подготовке дипломных работ, магистерских, кандидатских и докторских диссертаций. Будут полезны при разработке и совершенствовании курсов, спецкурсов и факультативов по истории Беларуси, белорусской государственности, отечественного молодёжного движения. Имеют практическое значение для перспективной разработки идеологии белорусского государства, могут быть востребованы органами власти и управления в процессе дальнейшего совершенствования и развития молодёжной политики Республики Беларусь.

**Область использования:** история Беларуси, история белорусской государственности, политическая история, социальная история, экономическая история, история культуры, образование.

## SUMMARY

Danilovich Viachaslau

### The youth in the socio-political, socio-economic and cultural construction of Soviet Belarus (1921–1939)

**Key words:** Soviet Belarus, youth, youth movement, youth organizations, komsomol, socio-political life, socio-economic development, culture

**The purpose of the study:** disclosure of content and forms of participation of youth in the socio-political, socio-economic and cultural building of Soviet Belarus in 1921–1939, determining of the most important periods, achievements and drawbacks of youth organizations' activity.

**Research methods:** analysis and synthesis, comparison and generalization, induction and deduction; historical-genetic, historical-comparative, historical-typological, historical-systemic, structural-diachronic.

**The results obtained and its novelty:** for the first time in historiography discloses in an integrated manner the process of participation of youth in the socio-political, socio-economic and cultural life of Soviet Belarus in 1921–1939; the periods of formation and development of the Komsomol have been defined; the characteristics of the national youth movement were reflected; characteristic features of youth participation in the activities state bodies and Soviets were defined; the forms and periods of development of the ideological-political educations of the young generation were identified and also the periods and features of participation of youth in the national-cultural life were shown.

**Recommendations on the use.** The results of the study can be used for research work during the preparation of theses, master's, candidate and doctoral dissertations. They will be useful for the development and improvement of courses, special courses and optional lessons on the history of Belarus, Belarusian statehood, and the national youth movement. They are of practical importance for the future development of the ideology of Belarus and can be demanded by the authorities and state governments in the process of further improvement and development of the youth policy of the Republic of Belarus.

**Field of application:** history of Belarus, history of Belarusian statehood, political history, social history, economic history, cultural history, education.